МОСКВА 19
УЛ. МАРКСА ЭНГЕЛЬСА 14
ВСЕСОЮЗНАЯ БИБЛИОТЕКА
ИМ. ЛЕНИНА
1.12 38

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 62 (5736) | 16 сакавіка 1937 г., аўторак | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

РАШЭННІ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б) ЗРОБІМ ЗДАБЫТКАМ КОЖНАГА КОМУНІСТА.

**Пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР** — Аб зацвярджэнні тав. Завенягіна А. П. першым намеснікам народнага камісара цяжкай прамысловасці; Аб зацвярджэнні тав. Граноўскага М. Л. першым намеснікам наркома юстыцыі Саюза ССР; Аб прысваенні заслужанаму артысту рэспублікі тав. Александраву А. В. звання народнага артыста СССР.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — **Узняць работу з партыйным актывам.**

**П. Лабаторын** — Перабудаваць работу РВК і сельсоветаў.

**К. С. Судніч** — Своечасова падрыхтавацца да яравізацыі.

**О. Ізмер** — Там, дзе адсутнічае партыйная работа.

**Р. Фралоў** — Разультат страты большэвіцкай пільнасці.

ЗАМЕСТ АГЛЯДУ ДРУКУ — Дробнае апякунства сакратара парткома.

ЗА РУБЯЖОМ:

Буйны поспех рэспубліканцаў на гвадалахарскім фронце.

Заява Ларго Кабальеро кореспандэнту газеты «Тан». На кангрэсе міру і дружбы з СССР.

## УЗНЯЦЬ РАБОТУ З ПАРТЫЙНЫМ АКТЫВАМ

«Таварыш Сталін пастаянна вучыць нас таму, што партыйны актыў мае асобнае палітычнае значэнне ў жыцці нашай партыі. Ён з'яўляецца правадніком у жыццё рашэнняў нашай партыі. Калі партыйнае рашэнне вынесена, лёс яго знаходзіцца ў руках актыва. Партыйны актыў з'яўляецца выражальнікам грамадскай думкі партыі». (З даклада тав. Жданава на Пленуме ЦК ВКП(б).

Чым лепш пастаўлена работа з партыйным актывам, чым больш партыйныя арганізацыі займаюцца любоўным вырошчваннем яго, тым лепш у гэтых арганізацыях пастаўлена ўнутрыпартыйная работа, тым мацней тут голас самакрытыкі, тым большая актыўнасць усіх комуністаў у вырашэнні ўсіх партыйных і палітычных пытанняў.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) не адзін раз указваў, якую велізарную ролю і значэнне адыгрывае партыйны актыў у жыцці партарганізацыі. У пастанове ЦК ВКП(б) ад 17 снежня 1934 года сказана:

«1. Прызнаць няправільным і не адпавядаючым нашым большэвіцкім традыцыям, што за апошні час пачалі збіраць у нашых сталічных цэнтрах для абмеркавання рашэнняў ЦК ВКП(б) не актывы гарадскіх арганізацый, як гэта было раней, а пленумы абкомаў і гаркомаў «з актывам».

2. Прызнаць, што гэта сумніцельнае ноўшаства паслабляе маральна-палітычнае значэнне актыва і ператварае апошні ў бюракратычную даважку пленума абкома і гаркома (збіраецца не актыў, а пленум абкома «з актывам»).

3. Аднавіць старое палажэнне, у сілу якога для абмеркавання рашэнняў ЦК ВКП(б) павінны склікацца, як правіла, актывы гарадскіх арганізацый, якія маюць і павінны мець сваё асабістае палітычнае значэнне ў жыцці нашай партыі.

4. Лічыць неабходным, каб ва ўсіх без выключэння рэспубліканскіх, краявых і абласных цэнтрах, а таксама ва ўсіх больш-менш значных прамысловых цэнтрах абавязкова склікаліся актывы гарадскіх партарганізацый для абмеркавання рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б), каб актывы склікаліся не для параду і фармальна ўрачыстага ўхвалення рашэнняў ЦК ВКП(б), а для сапраўднага іх абмеркавання, каб актывы працягваліся не 3—4 гадзіны, а 10—12 гадзін, каб у вялікіх цэнтрах (Масква, Ленінград, Харкаў, Кіеў і т. п.) склікаліся не толькі гарадскія, але і раённыя партактывы, каб раённыя актывы працягваліся не 3—4 гадзіны, а 6—8 гадзін мінімум».

З усёй яснасцю ў гэтай пастанове вырашана пытанне аб ролі гарадскога партактыва. Трэба прама сказаць, што гэта рашэнне ў Беларусі належным чынам не праводзілася. Кіраўнікі партыйных арганізацый, захопленыя гаспадарчымі пытаннямі вёскі, не арганізоўвалі як след сходаў партактыва, што прывяло да парушэння большэвіцкай традыцыі апоры на горад. На гэты сур'ёзны промах ЦК ВКП(б) у рашэннях Пленума зноў указаў партыйным арганізацыям. У святле гэтага ўказання арганізацыя работы з партактывам мае выключнае значэнне.

Члены КП(б)Б з усёй страсцю, прысутнай большэвікам, павінны выкрыць недахопы работы, каб не дапусціць іх у далейшым. А недахопаў гэтых многа. У радзе арганізацый КП(б)Б сходы партыйнага актыва адбываюцца ад выпадку да выпадку. Колькасць сходаў партактыва налічваецца адзінкамі. У менскай, напрыклад, партарганізацыі за 1936 год было ўсяго тры сходы гарадскога актыва, ды дзве лекцыі. Сходы партыйнага актыва часцей усяго прыўрочваюцца да агульнапалітычных кампаній. Рэдкія і амаль няма ў практыцы гарадскіх і раённых партарганізацый выпадкі таго, каб гарком і райком партыі паставіў-бы на абмеркаванне актыва рад пытанняў унутрыпартыйнага жыцця гэтай-жа партыйнай арганізацыі. З якой актыўнасцю абмяркоўваліся-б гэтыя пытанні! Які жыватворчы струмень унясло-б абмеркаванне гэтых пытанняў на актыве ў практыку работы партыйнага камітэта і ўсёй партарганізацыі!

На самай справе, калі-б роля і значэнне партыйнага актыва была-б зразумета ў Лепельскай акруговай партыйнай арганізацыі, калі-б акругком партыі быў-бы звязан з партарганізацыямі і партыйным актывам, хіба можна было-б дапусціць такое становішча, калі ў іх пад носам парушалі совецкія законы, а акругком партыі гэтага не заўважаў. Хіба пры добрай пастаноўцы работы з партыйным актывам можна было-б мець такое становішча, калі Віцебскі гарком партыі аказаўся аларваным ад пярвічных партарганізацый? Вядома не! Толькі канцылярска-бюракратычным метадам кіраўніцтва, небольшэвіцкай практыкай, заменай штодзённай карпатлівай работы з комуністамі папяровым кіраўніцтвам можна растлумачыць той факт, што асобныя гарадскія і раённыя камітэты партыі аказаліся адарванымі ад пярвічных партыйных арганізацый.

Рэдкім з'явішчам з'яўляецца той факт, калі на сходах актыва разгарнулася-б большэвіцкая крытыка канкрэтных недахопаў у рабоце партыйнага апарата. Яшчэ больш рэдкім з'явішчам з'яўляецца той факт, калі кіраўнікі партыйнай арганізацыі зрабілі-б справаздачу перад актывам аб тым, як яны выконваюць рашэнні сходаў партыйных актываў. Такая практыка па сутнасці зводзіць на-ніштo ролю і значэнне сходаў партыйнага актыва.

Партыйны актыў трэба трымаць у курсе жыцця партыйнай арганізацыі. Толькі пры гэтай умове партактыў будзе з'яўляцца баявым атрадам, быстра рэагуючым на ўсе прарывы, і здольным мабілізаваць масы на барацьбу з ворагам. Гэта ўмова работы з партыйным актывам у нас не выконваецца, што аслабляе ўзброенасць партактыва.

Горрайкомы не клапоцяцца аб тым, каб стварыць належныя ўмовы для работы па павышэнню палітычна-ідэйнага ўзроўню актыва. Яго заядае засядацельская мітусня. Возьміце рабочы дзень сакратара парткома. Колькі выклікаў у райком, гарком КП(б)Б. Прычым, часта сустракаецца, калі не паспеўшы прыйсці да сябе пасля выклікаў аднаго адзела гаркома, райкома, ён выклікаецца ў другі аддзел. Такім чынам праходзяць дні, калі ён абсалютна нічога не паспявае зрабіць у арганізацыі з комуністамі, нічога не прапрымае для работы над павышэннем свайго ўзроўню. З такой практыкай трэба неадкладна пакончыць.

Трэба, каб работа з актывам, які мае асобнае палітычнае значэнне ў жыцці нашай партыі, была-б пастаўлена на належную вышыню. Такая пастаноўка работы забяспечыць знішчэнне ўсяго таго, што перашкаджае росту актыўнасці комуністаў, узніме ролю і ўдзел кожнага комуніста ў актыўным палітычным жыцці партыі і краіны, павысіць боездольнасць кожнага комуніста ў асобку і партыйнай арганізацыі ў цэлым, забяспечыць ажыццяўленне задачы, пастаўленай Пленумам ЦК ВКП(б) быць на чале мас, на чале пазароту палітычнага жыцця краіны, на чале новых, да канца дэмакратычных выбараў.

Партыйны сход рабочых менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча па абмеркаванню рашэнняў пленума ЦК ВКП(б). Фото Я. Салавейчыка.

# Рашэнні пленума ЦК ВКП(б) зробім здабыткам кожнага комуніста

## СТАЛІНСКАЯ ПРАГРАМА ПЕРАБУДОВЫ ПАРТРАБОТЫ

Рашэнне пленума ЦК ВКП(б) знайшло шырокі водгук сярод комуністаў віцебскага чыгуначнага вузла. Гэта гістарычнае рашэнне комуністы зразумелі, як сталінскую праграму ў карэннай перабудове ўсёй партыйнай работы. Азнаёміўшыся з рашэннямі пленума, комуністы ў першую чаргу ўказваюць на канкрэтныя прыклады з жыцця і работы сваіх пярвічных партарганізацый.

Слесар паравознага дэпо — член партыі Астапаў прыводзіць характэрныя факты парушэння ўнутрыпартыйнай дэмакратыі. — Мяне, — гаворыць тав. Астапаў, — у мінулым годзе без ведама комуністаў, якія абіралі мяне парторгам, партыйны камітэт аслабаніў ад абавязкаў цэхпарторга. Такім-жа парадкам вылучылі другога таварыша, а праз месяц мяне зноў прызначылі цэхпарторгам. Таксама без партыйнага схода. Такім чынам увесь гэты год я фактычна працую назначаным цэхпартарганізатарам.

Факты парушэння партыйнай дэмакратыі, якія прыводзіць тав. Астапаў, далёка не адзінкавы ў партарганізацыі паравознага дэпо. Нават зараз партыйным арганізатарам цэха прамыўкі партком вылучыў комуніста Воланд. Воланд не зацвярджаўся агульным сходам комуністаў цэха. Або к прыкладу ўзяць такі выпадак: у склад парткамітэта быў казнітаваны Багданаў, які пасля быў выкрыты і выключаны з партыі, як актыўны меншавік.

У выніку зажыму крытыкі і самакрытыкі, грубага парушэння статута партыі ў складзе парткома да апошняга часу знаходзіўся актыўны контрраволюцыянер трацкіст Егораў.

Машыніст дэпо член партыі Коржанеў зусім правільна ставіць пытанне аб палепшанні работы палітаддзела. Тав. Коржанеў лічыць, што палітаддзел чыгункі павінен адчытвацца аб сваёй рабоце перад пярвічнымі партарганізацыямі, бо гэта практыкуецца ў часцях Чырвонай Арміі. Да гэтага часу палітаддзел віцебскага чыгуначнага аддзялення быў слаба звязан з пярвічнымі партарганізацыямі. Інструктары палітаддзела менш усяго займаліся канкрэтнай дапамогай пярвічным партарганізацыям, а, галоўным чынам, збіралі ўсякія весткі і зводкі. Палітаддзел павінен карэнным чынам перабудаваць стыль сваёй работы.

Комуніст партарганізацыі вагоннага ўчастка тав. Іваноў звярнуў увагу на тое, што на працягу некалькіх год мяняўшыяся парторгі тт. Міхайлаў і Пятроў не адчытваліся перад комуністамі. Ніколі таксама не адчытваўся перад партарганізацыяй і член віцебскага гаркома партыі Бых, абраны ў склад гаркома ад нашай арганізацыі.

Комуністы вузла горача вітаюць рашэнні пленума, якія яшчэ больш умацуюць рады большэвіцкай партыі. Усе комуністы таксама горача ўхваляюць рашэнне пленума аб выключэнні з радоў партыі растаўратараў капіталізма, здраднікаў рабочага класа — Бухарына і Рыкава.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.
Ф. СІНЕЛЬНІКАЎ.

## КОМУНІСТЫ НЯ ВЕДАЮЦЬ ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМА

Ужо прайшло дзесяць дзён, як апублікаваны рашэнні пленума ЦК ВКП(б). Аднак, у партыйнай арганізацыі завода імя Молатава не спяшаюцца вывучаць гэтыя важнейшыя партыйныя дакументы. Партыйнага схода для абмеркавання пастаноў пленума яшчэ не склікалі. Некаторыя члены партыі, як т. Мінкін, зусім не чыталі гэтых пастаноў.

— Куды спяшацца? Каму патрэбна такая гонка, — заяўляе сакратар парткома тав. Батукоў.

А спяшацца было неабходна, бо ў гэтай партарганізацыі ёсць аб чым пагаварыць і на агульным партыйным сходзе.

— У нашай партарганізацыі мелі месца скажэнні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі і парушэнне статута партыі, — гаворыць тав. Рубінштэйн. У нас да апошняга часу існавалі цэхавыя партгрупы. Партыйныя арганізатары гэтых груп на сходах не абіраліся, а проста назначаліся парткомам. Напрыклад тав. Кляўко, яго ніхто не абіраў парторгам, а тав. Лук'янчыка, хоць і абіралі на партгрупе, але ўсе загадзя ведалі, што ён вызначан і зацверджан парткомам. Сакратароў парткома ў нас змянілася за тры гады пяць чалавек. Іх нам рэкамендавалі прадстаўнікі гаркома. Я. праўда, галасаваў за іх, але зусім не ведаў, дзе і як яны да гэтага працавалі.

— Тры гады ў нас не было перавыбараў парткома, — гаворыць тав. Лук'янчык, а са старога складу парткома, які быў абран яшчэ ў 1934 годзе, асталіся толькі два чалавекі. Астатніх увесь час даабіралі. Глыбокае вывучэнне пастаноў пленума значна палепшыць партыйную работу. Тайныя выбары спрыяюць больш шырокаму разгортванню крытыкі і самакрытыкі і абавязваюць кожнага комуніста лепш ведаць і вывучаць людзей.

У гэтай партыйнай арганізацыі ёсць факты грубейшага заціску крытыкі. Слаба праводзіцца палітвыхаваўчая работа сярод беспартыйных рабочых. Пасля ліквідацыі цэхавых груп партыйная работа не перабудавана. Некаторыя былыя партарганізатары не маюць партыйных даручэнняў або маюць ды не выконваюць іх. Праверкі выканання партыйных даручэнняў з боку парткома няма.

Замест таго, каб усе гэтыя недахопы выявіць і перабудаваць партыйную работу на аснове глыбокага вывучэння пастаноў пленума, сакратар парткома тав. Батукоў яшчэ толькі раскачваецца.

М. ВАГАНАВА.

## СТРОГА ВЫКОНВАЦЬ СТАТУТ ПАРТЫІ

Партарганізацыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта глыбока вывучае рашэнне гістарычнага пленума ЦК ВКП(б) і выкрывае да канца тыя агіднасці па парушэнню ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, якія мелі месца ў партарганізацыі БДУ. На скліканых нарадах комуністаў у парадку падрыхтоўкі да агульнага схода, прысвечанага вынікам пленума ЦК ВКП(б), комуністы выявілі рад парушэнняў статута партыі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, як-та: ніхто з комуністаў універсітэта не памятае, калі рабіў справаздачу партком. За апошні год у арганізацыі змянілася 4 сакратары парткома. Ніхто з іх не абіраўся на агульным сходзе арганізацыі, за выключэннем апошняга сакратара тав. Грабштэйна. Некаторыя з іх нават аказаліся звязанымі з трацкістамі (Растоўская). Сапраўднай большэвіцкай крытыкі ў арганізацыі не было. Партком БДУ складаўся выключна з казнітаваных людзей, якіх ніколі ніхто не абіраў. Партком займаўся галоўным чынам гаспадарчымі справамі. У рашэннях парткома можна прачытаць такія перлы: «Слухалі: Аб бажах з кіпячонай вадой у інтэрнаце. Пастанавілі: Паставіць бажі ва ўсіх інтэрнатах універсітэта». Або яшчэ горш: «Слухалі: Аб адзнацы «здавальняюча» па ленінізму сакратару парткома Лепцу. Пастанавілі: Прапанаваць загадчыку вучэбнай часткі Каляцэ перагледзець і павысіць адзнаку», і г. д.

Партком займаўся пытаннямі каму якую адзнаку паставіць, парушаючы совецкія законы і правы выкладчыкаў. Ён падмяняў усіх, але ўнутрыпартыйнай работай, ідэйным узбраеннем комуністаў — тэорыяй Маркса—Леніна—Сталіна не займаўся.

Усё гэта гаворыць за тое, наколькі своечасовы і важны гістарычны рашэнні пленума ЦК ВКП(б), якія ставяць перад партыйнымі арганізацыямі і кіраўнікамі пытанне разгортвання ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі і стражэйшага захавання непарушальнага закона партыі — статута. З гэтых рашэнняў павінна зрабіць і зробіць для сябе ясны вывад партарганізацыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Г. МАХАНЕК.

Студэнт гістарычнага факультэта, намеснік сакратара парткома БДУ.

## ВЫХАВАЎЧУЮ РАБОТУ — НА ЎЗРОВЕНЬ СУЧАСНЫХ ЗАДАЧ

Комуністы крычаўскай раённай партыйнай арганізацыі па агульных сходах у партыйных школах з вялікім задавальненнем і аднадушна ўхваляюць гістарычнае рашэнне пленума ЦК ВКП(б).

Кожнае выступленне комуніста прасякнута большэвіцкай крытыкай работы райкома, сакратароў парткомаў і другіх кіраўнікоў партыйнай арганізацыі. А гаварыць ёсць аб чым.

Па працягу чатырох гадоў члены райкома не абіраліся, а каптаваліся. Нават нам. сакратара РК Бедынерман у мінулым годзе каптаван у склад пленума і бюро райкома.

За пяць год на Крычаўскім цэментным заводзе змянілася 8 сакратароў парткома, якія нікім не абіраліся і ніколі не адчытваліся ад сваёй рабоце.

Ужо чатыры месяцы не скліканіся партыйныя сходы ў партарганізацыі РВК, а за мінулы год было толькі 5 сходаў комуністаў партарганізацыі Эмануілаўскага спіртзавода.

Зараз пярвічныя партарганізацыі раёна глыбока вывучаюць рашэнні пленума ЦК ВКП(б), выкрываюць недахопы ў сваёй рабоце, намячаюць шляхі для практычнага ажыццяўлення рашэнняў нашай партыі.

На наразе партыйнага актыва, сакратароў парткомаў і парторгаў, дзе абмяркоўвалася рашэнне пленума, член партыі Вертліб сказаў:

— Да гэтага часу ні райком партыі, ні пярвічныя партыйныя арганізацыі не займаліся як след выхаваннем комуністаў, разгортваннем масава - палітычнай работы сярод рабочых і калгаснікаў. Інструктар райкома ў калгасе з'яўляецца вялікім госпем, бо бывае на сваім участку вельмі рэдка. Зараз член партыі будзе ў цэнтры ўвагі. Пастанова пленума прымусіць райком перабудаваць сваю работу, каб па-сур'ёзнаму заняцца выхаваннем кожнага члена партыі. Тайнае галасаванне дасць магчымасць абраць здольных, аўтарытэтных комуністаў на кіруючую работу.

У партарганізацыі Эмануілаўскага спіртзавода наглядаецца паўнейшы развал партыйна-масавай работы. Комуністы не хозяць на партыйныя сходы, не наведваюць партыйнай вучобы — гаварыў Банчыкаў. Дырэктар завода, член партыі Немалякін замест партсходаў ходзіць на паляванне, зажымае крытыку, груба адносіцца да радавых комуністаў-рабочых.

Асабліва многа гаварылі члены партыі аб рабоце партарганізацыі райсаюза (парторг Зеньковіч), пад бокам у якой жулікі Шнейдэрман і Шухман раскрадвалі камерацыўную маемасць, спекулявалі сукнам і мануфактурай. Усё гэта ведалі асобныя комуністы райсаюза, але маўчалі, бо і самі самазабяспечваліся, крэдытаваліся.

Комуністы крытыкавалі райком за дзяляцкую практыку захаплення гаспадарчымі пытаннямі на шкоду партыйна-выхаваўчай работе.

Партарганізацыі аднадушна адобрылі пастанову пленума ЦК ВКП(б) аб выключэнні з радоў партыі Бухарына і Рыкава, якія самкнуліся з контррэволюцыйнымі трацкістамі і разам з імі здрадзілі сацыялістычнай радзіме.

Партарганізацыя Крычаўскага раёна павінна на аснове глыбокага вывучэння рашэнняў пленума ЦК ВКП(б) перабудаваць сваю работу, каб павысіць актыўнасць і большэвіцкую боездольнасць кожнага комуніста.

А. КАЗІМІРАЎ.

## Аб зацверджанні тав. ЗАВЕНЯГІНА А. П. першым намеснікам народнага камісара цяжкай прамысловасці

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР **пастанаўляе:**

Зацвердзіць тав. **Завенягіна** Абрама Паўлавіча першым намеснікам народнага камісара цяжкай прамысловасці.

**Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР**
**М. КАЛІНІН.**

**Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР**
**І. АКУЛАЎ.**

Масква, Крэмль
14 сакавіка 1937 г.

## Аб зацверджанні тав. ГРАНОЎСКАГА М. Л. першым намеснікам наркома юстыцыі Саюза ССР

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР **пастанаўляе:**

Зацвердзіць тав. **Граноўскага** Майсея Лазаравіча першым намеснікам наркома юстыцыі Саюза ССР.

**Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР**
**М. КАЛІНІН.**

**Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР**
**І. АКУЛАЎ.**

Масква, Крэмль.
13 сакавіка 1937 года.

## Аб прысваенні заслужанаму артысту рэспублікі тав. АЛЕКСАНДРАВУ А. В. звання народнага артыста СССР

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР **пастанаўляе:**

За выдатныя заслугі ў справе культурнага абслугоўвання чырвонаармейцаў і камандзіраў, рабочых і калгаснікаў — прысвоіць заслужанаму артысту рэспублікі тав. **Александраву** Александру Васільевічу, мастацкаму кіраўніку чырвонасцяжнага ансамбля чырвонаармейскай песні і танца СССР, званне народнага артыста СССР.

**Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР**
**М. КАЛІНІН.**

**Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР**
**І. АКУЛАЎ.**

Масква, Крэмль,
14 сакавіка 1937 г.

# ДЗІЦЯЧАЯ ЗДРАЎНІЦА

Дарога зварачвае ў густы сасновы бор. З аднаго краю лесу шыр калгасных палёў, з другога краю, з абрыву, відаць рэкі—Дняпро і Бярэзіну. За рэкой — велізарны масіў лугоў. Лёгка ўявіць сабе, які гэта прыгожы куток зямлі, якое тут здаровае і чыстае паветра.

У глыбіні лесу, з-за дрэў, на шырокай адкрытай паляне літарай «П» устае прасторны аднапавярховы драўляны пёмназялёны дом. З карыдора адкрываецца від на пляцоўку перад будынкам, на якой вясною з'явяцца клумбы кветак і фантан. Адным радам па другому боку карыдора — пакоі алпачынку. Усе яны адзяляны пад адзін колер і будуць абстаўлены аднолькавай мэбляй.

Двума поўаваламі па абодвух баках будынка знаходзяцца пакоі, дзе можна будзе пагуляць у шахматы, шашкі, пачытаць газеты, паслухаць музыку. У доме ёсць ванны і душавыя пакоі, пакой урача, піонерважатых, сталовая, дзе выстраяцца ў роўныя рады дубовыя столікі.

Заканчваецца аддзелка глядзельнай залы. Сцены на палову аддзелваюцца пад ясень. Са столі вакол спускаюцца маляваныя пілястры пад колер слановай косці. Тут будуць адбывацца выступленні гурткоў мастацкай самадзейнасці, кіносеансы, а таксама масавыя калектыўныя гульні і танцы.

Усё гэта ствараецца для шчаслівых дзяцей совецкай краіны, дзе партыя і ўрад аддаюць вялікую любоў і ўвагу выхаванню падрастаючага пакалення.

Усебеларуская дзіцячая здраўніца будуецца ў 25 кіламетрах ад г. Рэчыцы і ў паўтара кіламетрах ад м. Горваль. У ёй будуць адпачываць па 75—100 дзяцей у змену. Дзеці атрымаюць электралячэнне, фізічныя метады лячэння, тут будзе рэнтгенаўскі габінет і кварцавыя лямпы. Абслугоўваючы персанал будзе складацца з урача, чатырох мельнічнскіх сясцёр, чатырох педагогаў, піонерважатых, 12 санітарак.

Будаўніцтва падыходзіць да канца. Асталося закончыць электрамантажныя і вадаправодныя работы. І па заяве дырэктара здраўніцы т. Нерынга 1 красавіка будзе прынята першая партыя адпачываючых дзяцей. Гэта было-б яго дрэнна, але мы павінны тут адзначыць, што будаўніцтва адбываецца без належнага тэхнічнага нагляду з боку Наркамаховы здароўя рэспублікі. У рэзультаце будоўля мае рад істотных недахопаў і недаробак. Напрыклад, веранды будуюцца са свежазрубленых дрэў, і гэта адбіваецца на якасці. У некаторых месцах ужо лопаецца тынкоўка. Раённыя арганізацыі не ўдзяляюць дастатковай увагі гэтай будоўлі рэспубліканскага значэння.

Народны камісарыят аховы здароўя павінен неадкладна ўзяць пад свой непасрэдны штодзённы кантроль будаўніцтва ўсебеларускай дзіцячай здраўніцы. Дзецям ордэнаносная БССР павінен быць прыпадносен падарунак, дастойны велізарнай увагі да іх партыі і совецкага ўрада.

**М. ГАСМАН.**

м. Горваль
Рэчыцкага раёна.

## ВЕСНАВЫЯ КАНІКУЛЫ Ў ШКОЛАХ

Паводле рашэння Наркомасветы БССР, з 25 па 31 сакавіка ва ўсіх пачатковых няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах рэспублікі праводзяцца веснавыя канікулы. У дні канікул для дзяцей будуць арганізоўвацца спецыяльныя кіносеансы, экскурсіі па назіранню за зменамі ў прыродзе ў сувязі з надыходам вясны і т. д.

У часе канікул ва ўсіх раёнах адбудуцца настаўніцкія канферэнцыі, прысвечаныя падвядзенню вынікаў работы за трэцюю чвэрць. Да канферэнцый рыхтуюцца выстаўкі вучнёўскіх прац.

(БЕЛТА).



На зімовых вучаннях ў часцях БВА. НА ЗДЫМКУ: камандуючы БВА камандарм 1-га ранга тав. УБАРЭВІЧ і камдзіў тав. СЕРДЗІЧ аб'язджаюць поле «бою» на камандзірскім танку.

Фото Я. Салавейчыка.

# МЕТАД ПАЎТОРНЫХ ПАГРУЗАК ДЫСПЕТЧАРА СТЭКТАРА

З вялікай увагай слухаў ля селектара участковы дыспетчар Стэткар наркома шляхоў зносін тав. Л. М. Кагановіч. Нарком паставіў задачу перад усімі чыгуначнікамі: грузіць чым пабольш вагонаў.

Стэткар добра зразумеў, што ад яго работы залежыць выкананне плана пагрузкі. Але-ж нехапае вагонаў. Што рабіць? Глыбока прадумаўшы парадак работы на станцыях, Стэткар рашыў прымяніць метад паўторных пагрузак паражняка.

Пасля некалькіх дзён работы яго меркаванні поўнасцю апраўдаліся. Адны і тыя-ж платформы пры яго дзяжурстве нагружаліся і разгружаліся па чатыры разы. 25 вагонаў перавезлі 100 вагонаў грузу.

Стэткар дэталёва вывучыў эканоміку свайго ўчастка, а таксама прылягаючыя да яго раёны і прадпрыемствы, ён ведае планы іх пагрузак і пункты назначэння.

Уступіўшы на дзяжурства, т. Стэткар дае на лінію план прасоўвання паездоў. Адначасова ён высвятляе колькасць грузу, фронт пагрузкі, лік паражняку на станцыях. Пасля гэтага ён разам з дзяжурным па аддзяленню намячае план пагрузкі, выгрузкі і перавозку, аб чым заараз-жа даводзіць да ведама работнікаў тых станцый і транспартных аддзелаў прадпрыемстваў, якія павінны непасрэдна прыняць удзел у выкананні гэтага плана.

Метад паўторных пагрузак тав. Стэткара падхоплен паасобнымі дыспетчарамі Беларускай дарогі. Дыспетчары Магілеўскага аддзялення Зянькоў, Філатаў і Куркін, прымяняючы метад Стэткара, дабіліся выкарыстання адной групы паражняку пад пагрузку на кароткія рэйсы на 6—8 разоў за змену.

Прымяненне метаду паўторных пагрузак давала ў лютым Беларускай чыгунцы не менш 100 вагонаў рэзерву ў суткі. Метад тав. Стэткара павінен быць падхоплен кожным дыспетчарам дарогі.

**А. ГІЗУНТЭРМАН.**

# ЗНІШЧЫЦЬ ШКОДНІЦКУЮ ПРАКТЫКУ Ў ПАРАВОЗНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

На студзеньскай селектарнай нарадзе нарком шляхоў зносін тав. Л. М. Кагановіч папярэдзіў работнікаў чыгуначнага транспарту аб тым, што ўсякае карыснае мерапрыемства, накіраванае на паляпшэнне работы, можа ў руках ворага, бюракрата і разгільдзяя стаць зброяй шкодніцтва і сабатажу. Да слоў, сказаных наркомам, яркай ілюстрацыяй можа служыць практыка прымянення антынакіпіна (хімічны састаў, які служыць для прадухілення катла паравоза ад накіпу) на Беларускай чыгунцы.

Як вядома, антынакіпін з'яўляецца адным з асноўных сродкаў падрыхтоўкі вады, што ідзе ў паравозны кацёл. Пры правільным прымяненні антынакіпін дае станоўчыя рэзультаты. Для гэтага патрэбна прытрымлівацца спецыяльнай рэцэптуры, умела карыстацца саставам у часе работы катла, бо ў састаў антынакіпіна ўваходзяць такія элементы, якія могуць аказваць разбурваючае ўздзеянне на метал. Гэта ўласцівасць і была выкарыстана варожай рукой, як зброяй зруйнавання асновы паравознай гаспадаркі — паравога катла.

Справа прымянення антынакіпіна была даручана начальніку цеплатэхнікі паравознай службы Беларускай чыгункі Зельціну, які не толькі не клапаціўся аб навядзенні парадку, а, наадварот, сам асабіста даваў шкодніцкія ўстаноўкі.

Па яго рэкамендацыі ў дэпо Сноўск ачыстка катлоў ад накіпу праводзілася варварскім шляхам, у кацёл кідаліся кавалкі каустычнай соды вагою 1—2 кілаграмы. Ясна, што кацёл, які быў так «ачышчан», быстра выходзіў са строю.

Ва ўсіх дэпо чыгункі важнейшая работа па прымяненню антынакіпіна абазлічана.

У Магілеўскім дэпо справай прымянення антынакіпіна запраўляў непісьменны прабівальшчык труб Рабзонаў, які на вока складаў сумесі, не разумеючы значэння не толькі кожнага элемента ў асобку, але і ўсяго складаемага ім састава.

У гомельскім дэпо да антынакіпіна нікто не прымацаван, ён састаўляецца выпадковымі людзьмі па даручэнню майстра. Дарэчы, майстар за гэта таксама не адказвае.

Ва унечаскім дэпо складаюць антынакіпін свабодныя ад работы... чорнарабочыя.

Абязлічка, сістэма безадказнасці з'явілася метадам дзеяння ворага для падрыву паравознай гаспадаркі.

Антынакіпін павінен старанна захоўвацца ад попадання шкодных прымесяў, якія разрушаюць метал. Між тым, у дэпо зроблена ўсё для шырокага прастору шкодніцтва. Амаль усюды бакі з антынакіпінам даступны для любога (Магілеў, Унеча і інш.).

Парадак выкарыстання антынакіпіна з'яўляецца лагічным прадаўжэннем той-жа злачыннай практыкі. У дэпо няма паўных норм залўкі антынакіпіна пры выхадзе паравоза ў паездку. У Магілеве існавала норма на паездку да Жлобіна 5 літраў, а назад — 3 літры. Нядаўна начальнік дэпо Хіхля павялічыў норму адпаведна 8 і 5 літраў, а чаму ён так зрабіў і сам адказаць не можа. Жлобінскае-ж дэпо на тую самую адлегласць устанавіла норму — 6 літраў.

Антынакіпін павінен ужывацца ў розных камбінацыях у залежнасці ад жорсткасці і іншых уласцівасцей вады, што пітаюць крыніцы, аднак гэта ігнаруецца не толькі на месцах, але і самой інструкцыяй НКПЗ, выданай 17 верасня 1935 года.

Калі бачыш у ёй подпісы заклятых ворагаў, трацкістаў Томленага і Ліўшыца, становіцца зразумелым, чаму ў ёй шмат пытанняў зусім абыйдзены, або няправільна асветлены: іменна антынакіпін быў адным з пунктаў прыцэлу шкодніцкай зграі.

Зараз неабходна навесці строгі парадак у прыгатаванні, хаванні і ўжыванні антынакіпіна па Беларускай чыгунцы і спыніць шкодніцкую практыку, якая вядзе да разбурэння паравозаў. Народнаму камісарыяту шляхоў зносін варта неадкладна пераглядзець шкодніцкую інструкцыю.

**Ф. М. ПЯТРОЎ.**

Пракурор Беларускай чыгункі.

# ЗАЦІСК САМАКРЫТЫКІ І СЯМЕЙНАСЦЬ

ШКЛОЎ. На торфзаводзе «Вольніца» творацца вялікія агіднасці. Дырэктар завода Грыгарэнка падабраў сабе цёплую кампанію, разам з бухгалтарам Здавенкам і механікам Дудзічам яны робяць свае цёмныя справы.

Пад выглядам неіснуючага будаўніцтва бухгалтар і механік атрымліваюць штомесячна дадатковую зарплату па 50 і 100 руб. Дырэктар выдае ім таксама незаконныя прэміі, за якіясьці эканоміі, у той час калі на заводзе ёсць страты.

У 1936 годзе торфзавод перавыканаў свой план. Але-ж зараз аказаўся недахоп у 1500 тон торфу, што складае 51—52 тыс. рублёў. Дырэктар сам разбазарыў торф, раздаў сваім знаёмым: начальніку ст. Шклоў Жаўхаўцу, начальніку пашпартнага стала Гутману і інш. Торф адпускаўся без вагі і дакументаў.

Каб застрахаваць сябе ад усякіх «непрыемнасцей», Грыгарэнка зволіў з канторы пад выглядам скарачэння штатаў рахункавода Кастрыцкую. Летам быў зволен з завода таксама стаханавец Ліпскі Васіль, які выконваў сваю норму на 200 проц. Калі Ліпскі зайшоў у кантору высветліць у чым справа, дырэктар яго выгнаў. Наогул, калі хто-небудзь прабуе супярэчыць, ён крычыць: «Вы аб адзіначаллі забываеце».

Адзіны прымацаваны комуніст, прафорг працуе на папяровай фабрыцы «Спартак», і на торфзаводзе яго ніколі не відаць.

Два месяцы таму назад заводу адпусцілі грузавую машыну. Яе патрэбна было даставіць са Смаленска. І вось дырэктар Грыгарэнка выдае даверанасць даставіць машыну свайму прыяцелю Чэрняцову, які не мае права на ваджэнне аўтамашыны. Чэрняцоў атрымаў машыну і па дарозе яе разбіў. Гэту справу замялі, каб ніхто і не ведаў.

Гора таму, хто асмеліцца пакрытыкаваць дырэктара на сходзе ці праз газету. Ён усёроўна знойдзе якую-небудзь прычыну і зволіць крытыка.

**Рабочыя завода (тры подпісы).**

# Грубае парушэнне Канстытуцыі

Дзевяцігадовы Шмулік — сын І. Л. Гуткіса, жыхара горада Бабруйска, з пачатку навучальнага года пайшоў у яўрэйскую школу. Але яго там не прынялі, а параіў паступіць у першую беларускую школу. Незадаволены бацька звярнуўся за дапамогай да старшыні горсовета т. Скакуна. Старшыня горсовета прапанаваў райана накіраваць хлопчыка ў школу, праверыўшы раней, у якой школе яму будзе лягчэй займацца.

У райана ўстанавілі, што хлопчык лепш уладае беларускай мовай, і таму накіравалі яго ў першую беларускую школу. Дырэктар школы т. Вайман сказаў бацьку хлопчыка, што прыязецца пачакаць некалькі дзён.

Час ішоў, а хлопчык нізе не вучыўся. Гуткіс штодзенна дабіваўся ў дырэктара першай школы, калі-ж, нарэшце, дазволяць яго сыну прыступіць да вучобы. Але Вайман, як відаць, рашыў не спыняць цяганіну і 20 снежня напісаў таварыскую запіску дырэктару 6-й яўрэйскай школы т. Кацельману, каб той прыняў хлопчыка ў сваю школу.

Тут зноў пачалі правяраць, на якой мове лепш гаворыць хлопчык. Дырэктар яўрэйскай школы зноў накіроўвае Шмуліка ў беларускую школу. Але і на гэтым абураючая цяганіна не скончылася. Дырэктары спрачаюцца паміж сабой, а хлопчык і па сёнешні дзень не вучыцца.

Бацька звярнуўся да сакратара горсовета т. Пеўзнера, каб ён дабіўся выканання прапановы старшыні горсовета. Але тав. Пеўзнер грозна прапанаваў Гуткісу пакінуць габінет, бо такія справы яго не датычаць.

Трэба, нарэшце, пакласці канец цяганіне і прымусіць валакітчыкаў і бюракратаў паважаць і выконваць асноўны закон нашай краіны — Сталінскую Канстытуцыю.

**В. БУДЗЕЙКА.**

# Вораг у лесгасе

— Я працую рахункаводам Іванаўскага лесаўчастка, Чэрвеньскага леспрамгаса. Жыццё навучыла мяне распазнаваць людзей. Прыглядаючыся да свайго начальніка, лесавода ўчастка Андрэя Комара, я ўпэўнілася, што гэта заядлы вораг, які на кожным кроку шкодзіць нашай дзяржаве.

Карыстаючыся бескантрольнасцю, Комар на працягу году галоў раскрадаў дзяржаўны лес, спекуляваў ім, перапрадаючы вакольным сялянам. Грошы за лес ён клаў сабе ў кішэню. Лясных вартаўнікоў Комар прыбраў к рукам пад пагрозай звальнення з работы.

Я ўвесь час хацела ўмяшацца ў гэту справу, але ўсё баялася. Нарэшце набралася мужнасці і ўказала Комару на яго незаконныя дзеянні, спасылаючыся на Сталінскую Канстытуцыю. Не паспела я выказаць некалькі слоў, як гэты шкоднік выкінуў мяне за дзверы.

— Новая шкадавальшчыца дзяржаўнай маёмасці знайшлася, — крыкнуў ён мне ўслед.

З таго часу Комар пачаў здзекавацца з мяне. Я рашыла напісаць аб усіх злоўжываннях Комара дырэктару лесгаса Рокуць, спадзяючыся, што ён, як член партыі, дапаможа мне. Аднак вялікае абурэнне ахапіла мяне, калі я даведалася, што маю заяву Рокуць пераслаў шкоднику Комару. Апошні, не доўга думаючы, зволіў мяне з работы. Больш месяца як я дабіваюся праўды.

**Каця ГРЫБКО.**

# Дакуль будуць здзекавацца над настаўніцай?

Настаўніца Шчэмелёва працавала ў Шчэглінцкай няпоўнай сярэдняй школе Магілеўскага раёна ў якасці выкладчыцы нямецкай мовы на працягу двух год. У канцы 1935 года яна пайшла ў дэкрэтныя адпачынак па цяжарнасці. Вось тут і пачынаюцца яе мытарствы і здзекі над ёю.

У першы дзень работы пасля вотпуску дырэктар школы Маськоў заявіў ёй, што яна знята з работы з тае прычыны, што з дзіцём не справіцца на рабоце. Гэта грубае парушэнне правоў жанчыны раёна адмяніў. Аднак, Маськоў на гэтым не супакоіўся, ён дабіваецца сваёй мэты.

Праз пару месяцаў Маськоў яе зноў зняў з работы, на яе пасаду прызначае сваю добрую знаёмую. І толькі пры ўмяшанні Наркомасветы Шчэмелёву накіравалі на работу ў Пашкоўскую школу. Але за вымушаны прагул і дапамогу на дзіцё ніхто ёй не выплачваў.

Шчэмелёва падала заяву аб выплаце ёй грошай у Наркомасветы. Наркомасветы прапанаваў магілеўскаму райана поўнасцю разлічыцца з ёй. Калі-ж Шчэмелёва з'явілася да загадчыка райана Верамюка за грашыма, то ён на яе пачаў крычаць і заявіў:

— Ніякіх грошай я табе не дам.

І тут-жа Верамюк разам з інспектарам райана Клімовічам налазілі ёй экзамен. Гэта ў той час, калі Шчэмелёва прайшла атэстацыю. Пры «экзамене» абыходзіліся з ёю груба, па-чыноўніцку.

З міласці Верамюка над Шчэмелёвай здзекваецца і загадчык Пашкоўскай школы Барысевіч, які чамусьці выклікае яе да сябе ў габінет, праводзіць допыты, не звязаныя з яе работай у школе. Барысевіч напкоўвае вучняў на яе, падрывае яе аўтарытэт сярод іх.

Паўстае зусім законнае пытанне — дакуль будуць здзекавацца над настаўніцай Шчэмелёвай зарваўшыеся чыноўнікі і іх апякуны з магілеўскага райана?

**Ч-ж.**

## Бяздушныя адносіны да стаханаўца

Я, рабочы-стаханавец г. Віцебска, жыву з сям'ёй у маленькім сырым і халодным пакоі. Два гады таму назад я падаў заяву ў віцебскі горкомгас аб тым, што ў такіх умовах больш нельга жыць. Спецыяльная камісія горкомгаса абследавала пакоі і склала акт, у якім указала, што мая кватэра сапраўды не падыходзіць для жылля і што мне трэба прадаставіць у першую чаргу другі пакой.

З таго часу я пачаў рэгулярна хадзіць у горкомгас, дзе з дня на дзень адцягвалі вырашэнне справы. Пасля некалькіх месяцаў мне, нарэшце, сказалі, што кватэр зараз няма. Так прайшоў яшчэ год. Зноў наступіла зіма. Сям'я літаральна замярзала.

— Я зноў пачаў хадзіць у горкомгас. Каб адчапіцца ад мяне, бюракраты з комгаса вызначылі зноў камісію для абследвання. Другая камісія пацвердзіла вывады першай. Але ад гэтага справа ні на крок не зрушылася. Тым часам захварэлі дзеці і я вымушан быў звярнуцца ў ЦВК БССР. ЦВК адразу пераслаў маю скаргу ў віцебскі горсовет для неадкладнага рэагавання. Горсовет-жа замест вырашэння справы пераслаў скаргу ў горкомгас, а апошні — зноў у горсовет. І так без канца.

**Стаханавец ГЕРШМАН.**

П. ЛАБАТОРЫН

# ПЕРАБУДАВАЦЬ РАБОТУ РВК І СЕЛЬСОВЕТАЎ

Сталінская Канстытуцыя кожным сваім радком, кожнай літарай прадугледжвае абарону інтарэсаў працоўных. Здавалася-б, што райвыканкомы павінны былі добра гэта ўлічыць. Чулыя адносіны да скарг працоўных — іх прамы абавязак. Па справе-ж выяўляецца адваротнае. У некаторых райвыканкомах і сельсоветах разгляд заяў і скарг працоўных праз меру зацягваецца, ніхто не вядзе іх уліку, ніхто ўдзяляе ім увагі.

Уваравіцкі РВК у 1936 годзе на працягу 75 дзён не разглядаў скаргу грамадзянкі Філіпавай аб няправільным адабранні каровы; справа грамадзяніна Механікава аб няправільным аштрафаванні на 65 руб. цягнулася 149 дзён, заява грамадзяніна Смалярова аб няправільным накладанні сельскагаспадарчага падатку разглядалася 92 дні; заява грамадзяніна Дударова аб знятці штрафу марынавалася 84 дні; заява Арцёменка аб няправільным продажы маемасці — 78 дзён; заява Шкрабкова аб няправільным адабранні каня — 140 дзён. Цэлы рад іншых заяў ляжаў без руху месяцамі.

Крыўскі сельсавет гэтага-ж раёна, як відаць, бярэ прыклад з РВК. Заява гр. Цынбранкова аб надзяленні яго сядзібай разглядалася на працягу 32 дзён; заява грамадзяніна Кавалёва аб надзяленні сядзібай разглядалася 33 дні; заява гр. Немчанка аб пакражы яблык — 52 дні; заява гр. Варанковай аб знятці культзбору — 34 дні і цэлы рад іншых заяў. Характэрна, што сельсавет больш месяца марыную заявы грамадзян, якія жывуць амаль побач з гэтай установай. Амаль штодзенна ў сельсавеце бываюць адказныя работнікі райвыканкома, але ніхто з іх не пацікавіўся праверыць, як сельсавет адносіцца да разгляду скарг працоўных.

У Сіроцінскім раёне не разгледжаны 52 заявы, якія паступілі ў розны час па розных пытаннях. Грамадзянка Шыкава скардзілася, што яе няправільна выключылі з калгаса. Заяву падала яшчэ ў верасні 1936 года. Адзін раз выклікалася на прэзідыум РВК, але паколькі яна далёка жыве ад раённага цэнтра, а праўленне калгаса не дало каня, то на прэзідыум яна не з'явілася. Заява да гэтага часу не разглядзена. Адказныя работнікі РВК часта наведваюць калгас, дзе пражывае гэта грамадзянка і маглі-б на месцы высветліць пытанне, ці абавязаць праўленне калгаса дапамагчы ёй прыехаць у раён і справа была-б вырашана максімум у 3—4 дні.

У Быхаўскім раёне ўлік заяў вядзецца, але не ўказваецца тэрмін выканання. За 1936 год паступіла ў РВК 127 скарг працоўных. На 60 не відаць адказаў. Трэба думаць, што яны яшчэ не разгледжаны.

Няма чаго даказваць, што падобная практыка ў далейшым проста недапушчальна.

***

Сталінская Канстытуцыя, ухваленая 170-мільённым совецкім народам і заперджаная VIII З'ездам Совецкаў СССР, патрабуе ад раённых выканаўчых камітэтаў і сельсоветаў адпаведнай перабудовы ўсёй іх работы.

Райвыканкомы павінны наладзіць штодзённае канкрэтнае кіраўніцтва первічным звяном совецкай улады — сельсоветамі, ажывіць работу секцый, упягнуць у яе ўсіх членаў сельсавета. Секцыі павінны стаць асноўным звяном, дзе ў першую чаргу абмяркоўваюцца ўсе пытанні, што стаяць перад сельсоветамі і калгасамі. Адказнасць за работу і кіраўніцтва секцыямі павінна быць ускладзена на загадчыкаў адпаведных аддзелаў райвыканкома.

Перад райвыканкомамі і сельсоветамі стаіць зараз адно з асноўных пытанняў — падрыхтоўка да веснавой сяўбы. Яны павінны загадзя паклапаціцца аб тым, каб усе трактары выйшлі на калгасныя палі ва ўстаноўленыя ўрадам тэрміны добра адрамантаванымі. Трэба своечасова забяспечыць ачыстку і пратручванне насення, вывазку гною, завоз у калгасы і соўгасы мінеральных угнаенняў і т. п. Асаблівую ўвагу неабходна ўдзяліць калгаснаму каню.

Барацьба за сталінскі ўраджай павінна стаць у цэнтры ўвагі РВК і сельсоветаў.

Сельскагаспадарчыя секцыі сельсоветаў павінны зараз паставіць пытанне аб падрыхтоўцы калгасаў да веснавой сяўбы (рамонт сельскагаспадарчага інвентара, загатоўка чыстагатунковага насення, ачыстка і пратручванне насення ў адпаведнасці з агратэхнічнымі ўказаннямі, догляд за канём). Па пытанню падрыхтаванасці да веснавой сяўбы варта было-б арганізаваць узаемную праверку калгаса калгасам, сельсавета сельсаветам, асабліва для тых, якія спаборнічаюць між сабою. Ініцыятарамі гэтай справы павінны стаць зямельныя аддзелы РВК звязаныя з сельскагаспадарчымі і жывёлагадоўчымі секцыямі сельсоветаў.

***

Перабудоўваючы ўсю сваю работу ў адпаведнасці са Сталінскай Канстытуцыяй, райвыканкомы павінны з'яўляцца застрэльшчыкамі ўсіх культурных пачынанняў, і тут ім трэба пачынаць з прывядзення ў культурны выгляд сваіх памяшканняў, каб паказаць прыклад сельсоветам, калгасам і калгаснікам.

На жаль, не ўсюды гэта так. Уваравіцкі райвыканком займае добрае памяшканне, але надзвычай запусцеў яго. Дубовыя ўваходныя дзверы на працягу доўгіх год служаць месцам для наклейкі аб'яў. Запэцканыя клейстарам, залепленыя брудным, счарнелай ад часу паперай, дзверы робяць прыкрае ўражанне на наведвальніка. У калідоры няма лавак і людзі сядзяць на вокнах, абіваючы нагамі тынк.

У памяшканні Глазаўскага сельсавета гэтага-ж раёна падлога ніколі не мыецца і нават не падмятаецца. На сценах няма ні аднаго партрэта. На ўвесь сельсавет тры ламаныя крэслы, на якія можна садзіцца толькі прыгуліўшыся да сценкі, каб не ўпасці. Паўтары месяцы назад кулілі, праўда, каналу, але яна ўжо таксама брудная. «Пісьмовыя сталы» пакрыты нейкім царкоўным рызззём, закапаным воскам і ледзь трымаюцца на ножках.

Будынак Сіроцінскага РВК маё звонку не кепскі выгляд. Але заглянем у сярэдзіну. Ужо адкрыўшы першыя дзверы, вы трапляеце ў цёмны калідор. Затым— у пакой агульнай канцылярыі. Сталы пакрыты брудным, алінялымі, залітымі рознымі чарнілами палотнішчамі. Сцены ва ўсім будынку з выцвіўшымі, абшарпанымі шпалерамі. Тое самае і ў габінеце старшыні.

У Быхаўскі райвыканком людзі заходзяць праз брудны двор. Унутры памяшкання — антысанітарыя, асабліва-ж у райана. Мэблі нехапае не толькі для наведвальнікаў, але і для супрацоўнікаў, якія трымаюцца прынцыпу: «трохі пасядзеў, дай другому пасядзець». У гэтай «культурнай» установе наведвальнікі прымаюцца стоячы.

***

Не на вышыні ў адзначаных раёнах і канцылярская справа. Ва ўсіх правераных Камісіяй партыйнага кантроля райвыканкомах і сельсоветах пратаколы прэзідыума афармляюцца з вялікім спазненнем, па сутнасці ўжо страціўшы сілу. Так, ва Уваравіцкім раёне пратакол прэзідыума ад 9 студзеня пачаў афармляцца толькі з 18 студзеня. У Сіроцінскім раёне ні адзін пратакол пасяджэння прэзідыума РВК ад 1, 9 і 19 студзеня ў дзень праверкі — 21 студзеня яшчэ не быў афармлен. Гэта значыць, што ўсе вынесеныя на гэтых пасяджэннях рашэнні страцілі сваю актуальнасць, стаўшы дакументам толькі для архіву.

Кантроль за выкананнем рашэнняў прэзідыума ва ўсіх правераных раёнах не наладжан. Уваравіцкі РВК у пратаколе № 2 ад 10 студзеня 1936 года запісаў рашэнне прэзідыума «Заслухаць на чарговым пасяджэнні прэзідыума старшыню сельсавета аб плане жывёлагадоўлі». Але не толькі на чарговым, але і на далейшых пасяджэннях гэта пытанне не ставілася. У пратаколе ад 9 сакавіка 1936 года па пытанню праверкі выканання калгасамі статута сельскагаспадарчай арцелі ёсць рашэнне: «Праз месяц заслухаць старшыню калгаса Жукава і старшыню сельсавета Скварцова аб выкананні гэтай пастановы». Нічога падобнага зроблена не было. У пратаколе ад 12 лютага 1936 года запісана: «Даручыць загадчыку райза расследаваць факты безгаспадарчасці ў калгасах і ўнесці на чарговае пасяджэнне прэзідыума». І гэта рашэнне засталося зноў-такі пустым гукам. Такія адносіны да ўласных рашэнняў зніжаюць іх аўтарытэтнасць.

Уваравіцкі РВК перастараўся толькі ў вынясенні сваім работнікам адміністрацыйных спагнанняў. Няма такога пратакола, дзе-б не была запісана вымова, ці не пастаўлена на від. Старшыня райспажыўсаюза за 1936 год атрымаў 3 вымовы, 2 папярэджанні і раз на від. Відаць, райвыканком не здолеў сваім аўтарытэтам прымусіць старшыню райспажыўсаюза па-сапраўднаму заняцца сваёй справай.

***

Кіраваць па-старому работай пасля зацвярджэння Надзвычайным VIII З'ездам Совецкаў Сталінскай Канстытуцыі, гэта значыць адстаць ад задач дня, адарвацца ад мас, жыць мінулым, не выканаць тых абавязкаў, якія ўскладзены на совэты на сучасным этапе социялістычнага будаўніцтва.

Новыя ўмовы работы, што выцякаюць са Сталінскай Канстытуцыі, патрабуюць усямернага пашырэння масавай базы совецкаў, уцягнення ўсё большага і большага ліку працоўных у практычную работу секцый, груп і камісій пры сельскіх і гарадскіх советах. Советы павінны нястомна клапаціцца аб тым, каб задаволіць запатрабаванні шырокіх мас працоўных горада і вёскі. Бюракратызму павінна быць абвешчана бязлітасная барацьба. Таварыш Сталін указаў, што новая выбарчая сістэма будзе «бізуном у руках насельніцтва супроць дрэнна працуючых органаў улады». Задача райвыканкомаў, горсоветаў і сельсоветаў — паставіць сваю штодзенную работу так, каб узняць яе на ўзровень запатрабаванняў народу і вялікай Сталінскай Канстытуцыі.

# ДРОБНАЕ АПЯКУНСТВА САКРАТАРА ПАРТКОМА

**(Шматтыражка «Чырвоны абутнік, орган парткома менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча).**

Праглядаючы архіў шматтыражкі «Чырвоны абутнік», здзіўляе поўная адсутнасць на яе старонках матэрыялаў аб жыцці партыйнай арганізацыі завода. Ня-і сур'ёзнай большэвіцкай самакрытыкі. Газета ўзняла рад вытворчых пытанняў, але ніхто па іх не рэагаваў. Сама-ж шматтыражка па гэтым супакоілася.

Калі рабкор тав. Лізурык рашыў пакапаць у сваёй шматтыражцы рабочы дзень цэха пашывачнага цэха, ён быў упэўнены, што газета даб'ецца знішчэння непадкаў, якія там ёсць.

Добрасумленна ён прыглядаўся 10 люта да работы другой змены свайго цэха. Значаў розныя тормазы, запісваў усе застоі. Атрымаўся досыць сумны малюнак. Па віне майстра тав. Ліберштэйна цэха пачала працаваць на 10 мінут пазней вызначанага часу. На працэсе прыжкі задпікаў падаваліся калодкі і загатовкі розных нумароў (загатоўк № 29, а калодкі № 28). Пакуль разабраліся з калодкамі, заўважылі, што частка чаравікаў ідзе па канвееру з незадягнутымі наскамі бо ў абцяжніка тав. Пятроўскага сарвалася мапына, і ён працаваў уручную. Потым сапсавалася стэпельная машына, што выклікала прастой усяго агрэгата на 15 мінут. Пералік непаладкаў на гэтым далёка не вычэрпваецца. Усе яны выявілі да таго, што ў гэты дзень змена не выканала свой план — замест патрэбных 1.608 пар, выпусціла ўсяго 155.

Шматтыражка змясціла матэрыял тав. Лізурыка ў нумары ад 16 лютага і... на гэтым супакоілася. А кіраўніцтва цэха не знайшло патрэбным заняцца знішчэннем недахопаў, паказаных у заметкі рабкора. Ды выніку цэх працягвае адставаць і зараз — з дня на дзень не выконвае свайго плана.

16 студзеня «Чырвоны абутнік» змясціў лісьмо знатнага стаханаўца тав. Скабло Г., у якім ён указваў на недобрасумленныя адносіны да працы раду рабочых, на парушэнне імі 130 і 131 артыкулаў Сталінскай Канстытуцыі. Тав. Скабло патрабаваў дакладнага выканання абавязкаў, вынікаючых грамадзян, якія патрабуюцца падчас Сталінскай Канстытуцыі. Газета змясціла адначасова з гэтым лісьмом і вокліч на выступленне тав. Скабло — пастанову нарады стаханаўцаў фабрыкі з разгорнутым канкрэтных абавязацельстваў.

Пытанне ўзнята надзвычай важнае. Заслуга газеты заключалася ў тым, каб пасапраўдна асвятлянь, як рабочы калектыў выконвае практыцы ажыццяўляе прапанову свайго лепшага стаханаўца, як праводзяцца ў жыццё абавязацельствы, прынятыя ў сувязі з гэтым нарадай стаханаўцаў. Але нічога палобнага газета не зрабіла. Змясціўшы лісьмо і пастанову нарады, яна больш не звярталася да ўзнятых у іх пытанняў.

У чым справа? Чаму газета не асвятляе партыйнага жыцця, чаму яна на сваіх старонках слаба разгортвае самакрытыку, чаму сігналы газеты застаюцца нікім непачутымі, а сама шматтыражка не змагаецца за дзейнасць змяшчаемых матэрыялаў?

Аказваецца, ужо пяць месяцаў як няма рэдактара. Газету падпісвае рэдкалегія, а па сутнасці яе няма. У рэдкалегію калісьці абралі пяць чалавек, з якіх тав. Грабштэйн (былы рэдактар) выбыў, тав. Буніна 8 месяцаў як не прапавала, а астатнія тры таксама лічацца толькі на паперы. Сярод іх ёсць адзін комуніст тав. Купрэеў, уздел якога ў газеце абмяжоўваецца... выдаткаваннем грошай на выданне газеты.

Хто-ж робіць газету? Гэту адказную справу даверылі беспартыйнаму таварышу.

Партыйны камітэт фабрыкі, і ў прыватнасці яго сакратар тав. Гефен, сваё «аператыўнае» кіраўніцтва работай шматтыражкі зводзіць да запвярджэння плана нумара газеты і прагляду матэрыялаў да друку. Ён па сутнасці ператварыўся ў дробнага апякуна газеты і цэнзара.

Гэта і з'яўляецца прычынай таго, што газета амаль зусім не асвятляе партыйнага жыцця. З 8 нумароў (лістапад—люты) толькі ў нумары ад 30 снежня 1936 г. змешчаны дзве самаўсхваляючыя заметкі.

Адсутнасць на старонках газеты матэрыялаў аб партыйным жыцці тым больш здзіўляе, што з гэтай справай на фабрыцы далёка не ўсё добра. Прывялем толькі некалькі прыкладаў. Партыйныя групы ў большасці сваёй займаюцца гаспадарчымі пытаннямі і не праводзяць партыйна-масавай, палітычнай работы. Партком слаба кіруе парторгамі. Парторг фабрыкакіраўніцтва тав. Унеха працуе чатыры месяцы. Яго група складаецца з 11 чалавек і яднае комуністаў пажарнага дэпо, работнікаў канторы і сталоўкі. Склад розностайны і тав. Унеха яшчэ не здолеў наладзіць работу. Партком-жа не лічыць патрэбным дапамагчы яму.

Памянёнымі фактамі далёка не вычэрпваюцца хібы работы парткома. Але комуністы аб іх не пішуць у сваю газету. Чаму? Прычына становіцца зразумелай, калі ўспомніць сказанае ўжо раней, што газету фактычна рэдагуе сам сакратар парткома і не можны адважыцца крытыкаваць партком, ведаючы, што матэрыял пападзе ў рукі сакратара.

# ДРОБНАЕ АПЯКУНСТВА САКРАТАРА ПАРТКОМА

Зімовыя вучэнні ў часцях ВВА. НА ЗДЫМКУ: байцы тт. Міцін і Ерынаў абстрэльваюць самалёт «сініх».
Фото Я. Салавейчыка.

# ПАРТГРУПА ГОРСОВЕТА БЯЗДЗЕЙНІЧАЕ

Тав. Жданаў у сваім дакладзе на пленуме ЦК ВКП(б) гаварыў:

«У нас ёсць даволі значны слой работнікаў у партыйных і совецкіх арганізацыях, якія лічаць, што іх задача, уласна, скончана тады, калі яны абраны ў совет. Аб гэтым сведчыць вялікая колькасць адказных работнікаў, не наведваючых пленумаў советаў, дэпутацкіх груп і секцый нашых советаў, якія ўхіляюцца ад нясення элементарных дэпутацкіх абавязкаў».

Гэта, нашэўна, адносіцца да Менскага горсовета.

Мы маем рад дэпутатаў горсовета, якія праяўляюць саноўна-барскія адносіны да выканання сваіх абавязкаў, не прымаюць актыўнага ўдзелу ў рабоце горсовета і нават не наведваюць пленумаў горсовета, яго секцый, не гаворачы ўжо аб рабоце ў дэпутацкіх групах.

З 25 пленумаў горсовета (з часу выбараў горсовета) прымалі ўдзел: Дзікоўскі (дырэктар завода імя Мяснікова) — чатыры разы, Кавальчук (былы старшыня ПСПСБ) — чатыры разы, Валодзька (Наркомсувязь) — дзевяць разоў, Амбражунас (Наркомгас) — дзесяць разоў.

Яшчэ горш абстаіць справа з наведваннем секцый горсовета. На паперы — усе члены горсовета працуюць у адной з секцый горсовета, але на справе атрымліваюцца напляванельскія адносіны раду дэпутатаў, у тым ліку і членаў прэзідыума да работы ў секцыях.

Сярэдні процант наведвання секцый дэпутатамі горсовета комуністамі складае 35—40 проц., а беспартыйнымі — 60—70 проц.

Возьмем, напрыклад, жыллёвую секцыю. Загадчык жыллёва-зямельнага кіраўніцтва тав. Гальперын з 17 секцый наведаў толькі адзін, прычым апошні раз тав. Гальперын быў на секцыі, прыкладна, год таму назад, а з таго часу і духу яго там не было.

Возьмем секцыю народнай асветы. Гэта секцыя за два гады збіралася 13 разоў. Член прэзідыума горсовета — загадчык гарана тав. Кузняцова наведала секцыю чатыры разы. Пасюкевіч (камітэт па справах мастацтва)—адзін раз, наогул т. Пасюкевіч адносіцца па-барску да ўдзелу ў рабоце горсовета і наўрад ці заслугоўвае ён давер'я выбаршчыкаў, Грыцкевіч (профсаюз сярэдняй школы) — тры разы і т. д.

Такое-ж становішча і ў іншых секцыях.

Хіба не ганьбай для некаторых партыйных арганізацый і для саміх комуністаў з'яўляецца тое, што ў часе справаздачнай кампаніі ў кастрычніку—лістападзе 1936 года некаторыя комуністы — дэпутаты горсовета, у сувязі з іх бяздзейнасцю былі выбаршчыкамі адкліканы з горсовета (Мікульскі — Дзяржбанк, Крэсік — завод імя Варашылава, Калеснікаў — служба шляхоў і інш.). Ці зрабілі ўказаныя партарганізацыі якія-небудзь вывады для сябе і ў адносінах да гэтых комуністаў? Гэты факт прайшоў міма партарганізацый да гэтага адносіся як да звычайнага з'явішча.

Прэзідыум горсовета гніла-ліберальна адносіўся да гэтых фактаў і не ставіў пытання перад выбаршчыкамі аб тым, што некаторыя дэпутаты не апраўдваюць іх давер'я.

Партыйная група прэзідыума горсовета, задачай якой па статуту партыі з'яўляецца «ўсебаковае ўзмацненне ўплыву партыі і правядзенне яе палітыкі ў безпартыйным асяроддзі, умацаванне жалезнай партыйнай і совецкай дысцыпліны, барацьба з бюракратызмам, праверка выканання партыйных і совецкіх дырэктываў», больш за ўсё займалася не гэтымі пытаннямі, а вырашэннем дробных, бягучых пытанняў. Партгрупа пленума горсовета за два гады сабралася толькі ў двух урачыстых выпадках — для вырашэння арганізацыйных пытанняў.

Сталінская Канстытуцыя, рашэнні пленума ЦК ВКП(б) па дакладу тав. Жданава, з усёй вострасню ставіць пытанне аб перабудове работы партыйных і совецкіх органаў.

Роля советаў і актыўны ўдзел у іх выбраных дэпутатаў невымяральна ўзрастае. Партыйныя арганізацыі і маса выбаршчыкаў павінны ўзяць пад жорсткую большэвіцкую крытыку работу горсовета, яго прэзідыума і дэпутатаў.

**Э. ЛЕЎСОН.**

# ТАМ, ДЗЕ АДСУТНІЧАЕ ПАРТЫЙНАЯ РАБОТА

У сістэме Наркомлеспрома ёсць трэст «Белхімлес». Ён з'яўляецца пастаўшчыком сыравіны для важнейшых галін прамысловасці. Жывіца з'яўляецца асноўнай і галоўнай сыравінай для каніфольнай і шкіпідарнай прамысловасці.

Паспрабуйце пагаварыць з дырэктарам трэста тав. Капланам, ён адразу разгортвае перад вамі зводкі, якія характарызуюць нібы перавыкананне планаў за 1936 год. Фармальна ўсё ў парадку. А на самой справе ў трэсце — абураючыя агіднасці. Як і сам апарат, так і перыферыя значна засмечаны чужымі элементамі. Усімі справамі ў трэсце фактычна верхаводзіць не яго афіцыяльны дырэктар Каплан, а галоўны бухгалтар Леўдчэнку.

Леўдчэнку — чалавек з цёмным мінулым. Ён не раз быў судзім. У яго актыве ёсць і судзімасць за ўкрывацельства шкодніцтва ў групе соўгасаў Халопеніцкага раёна ў бытнасць яго работы ў Наркамземе пад кіраўніцтвам контррэволюцыянера Прышчэпава. Усё гэта вядома і Каплану, і первічнай партарганізацыі. Гэта павінна было настаражыць увагу да гэтага чалавека. Разам з тым ні дырэктар трэста, ні партыйная арганізацыя нічога не зрабілі для таго, каб выкрыць сапраўдны твар Леўдчэнку. Карыстаючыся сваім становішчам, Леўдчэнку і ў самым трэсце па сутнасці ўзначальваў шкодніцкую работу.

Пры яго дапамозе на перыферыі насаджаліся аферысты, якія свядома развальвалі работу, раскрадалі сацыялістычную ўласнасць. Вось асобныя факты. На чалі слуцкай лесхімгаспадаркі быў пастаўлен аферыст Пшыкін, а старшым бухгалтарам такі-ж аферыст Валенцюкевіч. Гэта пёнлая кампанія на працяту доўгага часу раскрадала сацыялістычную ўласнасць, свядома зрывала выкананне плана. Несумненна, у апараце трэста было нямала сігналаў аб гэтай шкодніцкай рабоце. Для адводу вачэй туды накіроўваецца рэвізор Аронін. Аронін, з'яўляючыся рэвізорам трэста, аказаўся яўным аферыстам, выкрытым і арыштаваным органамі НКУС. І вось пры дапамозе гэтага «рэвізора» прымаюцца ўсе меры да таго, каб утоіць ад пролетарскай дзяржавы ўсе гэтыя шкодніцкія справы, усе гэтыя злачынствы. З мэтаю накіраваць справу на ілжывы шлях, яны крадуць у прараба, члена партыі Ефімава дакументы на 5 тысяч рублёў. Гэтага Ефімава знімаюць з работы, аддаюць пад суд. Апрача ўсяго, гэты «рэвізор»-аферыст Аронін крадзе з касы слуцкай лесхімгаспадаркі 2.880 руб.

Слуцкія справы — не выключэнне. Аналагічныя факты мелі месца і ў узлескай лесхімгаспадарцы і ў радзе іншых участкаў. На чале бабруйскай лесхімгаспадаркі стаяў трацкіст Гельфанд. Яго ўсяляк выхвалялі, яго ставілі ў прыклад другім, яго нават высунулі намеснікам дырэктара трэста. Толькі пасля таго, як гэты тып быў выкрыт бабруйскім райкомам, сёй-той у трэсце пачаў казаць, што не заўважвалі яго трацкісцкую дзейнасць. Натуральнае пытанне, чым-жа займалася партыйная арганізацыя. Як яна рэагавала на гэтыя факты?

Трэба прама сказаць, што партыйнай арганізацыі, як па-большэвіцку наладжанай, боездольнай арганізацыі, здольнай мабілізаваць калектыў работнікаў на выкананне важнейшых задач партыі, — у трэсце не існуе, хоць фармальна комуністы і збіраліся і абмяркоўвалі шматлікія пытанні, у тым ліку не раз абмяркоўвалі і пытанні выканання плана (замяняючы сваімі пастановамі загады дырэктара трэста).

Звадкі і сваркі, непрыязнасць адзін да аднаго — вось што характэрна для гэтай арганізацыі. Тут многім здаецца, што яны адзін у аднаго стараюцца партфелі адабраць. Адсюль і якасць работы парт-арганізацыі.

Брудныя гісторыі, абывательская твань пачынаюць апутваць асобных людзей. Гэта і патрэбна класаваму ворагу. Ён гэта выкарыстоўвае як добрую маскіроўку для сваёй варожай дзейнасці.

Класавы вораг выкарыстоўвае гэтыя факты для таго, каб дэмаралізаваць калектыў. Яшчэ ў мінулым годзе не толькі па трэсту, але і па перыферыі пайшлі чуткі аб тым, што дырэктар трэста Каплан сажыцельствуе з супрацоўніцай П.... Леўдчэнку з'яўляецца адным з главароў, які ўзмоцнена распаўсюджвае гэтыя гутаркі. Партыйная арганізацыя не занялася гэтай справай, неадкладна не рэагавала. Наадварот, комуністы ўцягнуты ў гэтыя брудныя абывательскія падзеі. А Каплан, відаць, грунтоўна заблытаўся ў гэтых пінетах, што аказаўся нездольным рэагаваць на ўсё гэта. Але гэтым не вычэрпваецца ўся гэта абывательская агіднасць. Па трэсту ўжо ходзяць анекдоты аб тым, што дырэктар Каплан сажыцельствуе ўжо не з адной П..., а і з другімі супрацоўніцамі апарата. Сёй-той з комуністаў трэста, прыняўшы на сябе ролю следчых, пачалі выклікаць да сябе супрацоўніц і дапытваць, ці быў з імі Каплан у інтымных сувязях. Справа даходзіць ужо да таго, што супрацоўніцы П. і К. на ўсебеларускай нарадзе дырэктароў, прарабаў і стаханаўцаў сістэмы Лесхімпрома наладжваюць сапраўдную бойку паміж сабой, дзе ў ход пайшлі чарнільніцы і іншыя прадметы канцылярскага ўжытку. Канферэнцыя ператварылася ў спектакль, галоўнымі дзейнічаючымі асобамі якіх аказаліся Каплан, супрацоўніцы П. і К. І тут умелым рэжысёрам аказаўся гэты Леўдчэнку. Комуністы і тут аказаліся не ў дастойнай ролі. Кожны з іх ад гадавальнення пацірпаў рукі. Яны не разумелі і не хацелі зразумець, што вораг зусім свядома інсцэніруе ўсе гэтыя сцэны «любві і измены» для таго, каб развальваць сістэму, зрываць падрыхтоўку да выканання плана, разлагаць сістэму. На жаль, яны і зараз працягваюць гэту практыку.

Прыходзіцца толькі здзіўляцца, чаму Кагановіцкі горкайком, якіх добра праінфармаван аб усіх гэтых «справах», своечасова не рэагаваў на ўсё гэта.

Трэст змяшчаецца ў адным будынку з Наркомлесам. Астаецца незразумелым, чаму кіраўніцтва Наркомлеса, на вачах якога развальваецца трэст, палец аб палец не ўдарае для таго, каб знішчыць увесь гэты клубок шантажу, які творацъ класавыя ворагі.

**О. ІЗМЕР.**

# РЭЗУЛЬТАТ СТРАТЫ БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПІЛЬНАСЦІ

Закапуўшы палітычную работу ў масах, Даманавіцкі райком партыі і ў першую чаргу яго кіраўнікі праглядзелі злачынную работу ворагаў. Іх палітычная блізарукасць, адрыў ад мас прывялі да таго, што ворагі народа знішчожылі ў 1936 годзе больш 500 галоў калгасных коней і 180 жарабят.

У асобных калгасах гэтыя ворагі знішчылі амаль палову конскага пагалоўя. У сельгасарцелі «Авангард», Новасёлкаўскага сельсовета, у 1936 годзе пала 35 коней, а за два месяцы 1937 г. яшчэ 10. Зусім бясспрэчна, што гэта—справа рук варожых элементаў. Для таго, каб пакверзіць гэта, трэба толькі прыглядзецца к таму, хто акружае гэты калгас, хто перш за ўсё віноўны ў падзяжы коней. Вось асобныя факты: калгаснік Мушкавец перагнаў двух коней і яны палі. Аказваецца, Мушкавец зрабіў гэта свядома, па заданню былых раскулачаных кулакоў — Герасіменка, Тозіка і Дзімідовіча, якія, вярнуўшыся з ссылкі, пасяліліся на сваіх былых хутарах і вядуць падрыўную работу.

Прымацаваны да калгаса «Авангард» ветэрынарны фельчар Крышталенка — цёмная асоба. Паводзіны Крышталенка і ў часе падзяжу калгасных коней з'яўляюцца паскрозь варожымі. Спачатку ён зусім адмовіўся ехаць у калгас лячыць коней, а калі яму загадалі, ён прыехаў і пачаў «лячыць» так, што за 3—4 дні пала больш 10 галоў самых лепшых коней.

Усё гэта праглядзелі палітычна сляпыя кіраўнікі раёна, якія адарваліся ад мас. Яны не маглі своечасова выкрыць шкодніцкую дзейнасць у буйнэйшым калгасе раёна. Раённая пракуратура таксама не заўважыла варожых дзеянняў у фактах падзяжу коней у калгасе. Усе матэрыялы, якія паступалі ў пракуратуру, перадаваліся ёю ў народны суд для разгляду ў парадку грамадзянскіх іскаў.

Не выкрыты да гэтага часу ворагі народа і ў сельгасарцелі «Новыя Шыячы», Сухавіцкага сельсовета. Там шкоднікі знішчылі 25 коней. Галоўныя арганізатары падзяжу — браты Чарняўскія.

Цесная сувязь Чарняўскіх з былымі кулакамі—Канашом, Палазнікам і Садоўскім, якія жывуць на тэрыторыі калгаса, сведчыць аб тым, што падзеж коней у калгасе ёсць варожая дзейнасць ворагаў калгаснага будаўніцтва.

Шкодніцкая дзейнасць мае месца і ў радзе іншых калгасаў раёна («Звязда», Зеляноўскага сельсовета, «Комінтэрн», Кайліцкага сельсовета, «Дзень ураджаю», Марцінавіцкага сельсовета і т. д.). У сельгасарцелі «Новы шлях», Асташкавіцкага сельсовета шкоднікі арганізавалі раскраданне калгасных кармоў. Зграя зладзеяў з вёскі Карповіч на чале з прайдзісветам Спепаненкам Парфенам раскрэлі 17 стагоў калгаснага сена. Калгасныя коні асталіся без корму, ад зморвання пачынаюць падаць.

Ворагі народа праводзяць сваю шкодніцкую дзейнасць і на іншых участках калгаснага будаўніцтва. Яны ставяць сваёй мэтай тармазіць усяжім спосабам павышэнне вагі працадня калгасніка. Для дасягнення гэтай мэты ворагі дзейнічаюць у напрамку знішчэння гатунковага насення ў калгасах. Так, у сельгасарцелі «Чырвоная зорка», Хамецкага сельсовета гатунковы авёс у колькасці 76 цэнтнераў скармілі жывёле, а ў сельгасарцелі «Чырвоная перамога», таго-ж сельсовета, 64 цэнтнеры гатунковага ячменю размеркавалі на працадні калгаснікам.

Палітычная слепата настолькі засланіла вочы кіраўнікам райкома, што яны нават не маглі доўгі час распазнаць і выкрыць ворагаў, якія пралезлі і ў рады партыі. Актыўным трацкістам—Рыкліну і Ліўшыцу былі выданы партыйныя білеты новага ўзору. Іх удалося выкрыць толькі нядаўна. Гэта сведчыць аб тым, што райком партыі і ў першую чаргу яго кіраўнікі страцілі рэволюцыйную пільнасць і не заўважаюць, што ў іх пад носам арудуюць ворагі. Аб страце рэволюцыйнай пільнасці гаворыць і такі факт. Былы сакратар райкома Шэфтар рэкамендаваў нейкага Захарава на работу ў гарачыцкае сельпо, дзе гэты жулік праз некаторы час растраціў 9 тыс. рублёў каапаратыўных грошай.

Жулікі арудуюць і ў раённай канторы Заготжывёлы. Гэтыя жульніцкія махінацыі пакрываюцца ўпаўнаважаным камітэта загатовак Аўсейчыкам, які сабутэльничае з імі і атрымлівае ад іх падачкі. Комуністы гэтай арганізацыі страцілі большэвіцкую пільнасць і таму не могуць распазнаваць варожыя дзеянні жулікаў.

Асноўная прычына такога становішча крыецца ў зусім нізкім узроўні ўнутрыпартыйнай і палітмасавай работы, у адсутнасці правільнага большэвіцкага кіраўніцтва, у адсутнасці крытыкі і самакрытыкі. У первічных арганізацыях раёна і ў самім райкомэ партыі звыкліся жыць мірна і спакойна. Склікаемыя раённыя партыйныя сходы ператварыліся ў «накачку» нізавых работнікаў сакратарамі райкома, старшынёй і загадчыкамі аддзелаў райвыканкома. Крытыкі знізу не было ніколі.

А калі хто і адважваўся крытыкаваць начальства, то яму потым нездаровілася. Аднаго разу былы парторг первічнай арганізацыі МТС Мельцар сказаў другому сакратару райкома Калбасаву, што па яго думцы ў Даманавіцкім раёне мала аддаюць увагі вырошчванню кадраў. Гэта зусім правільная заўвага закрапула самалюбнасць Калбасава. Назаўтра-ж ён склікаў райком і дабіўся знятця Мельцара з работы парторга, як чалавека, «які падрываэ аўтарытэт райкома партыі».

Такавы вынікі «работы» Даманавіцкага райкома партыі, вынікі страты ім большэвіцкай пільнасці і палітычнай чуласці.

**Р. ФРАЛОЎ.**

# ВКЛЮЧАЕМСЯ ВА УСЕСАЮЗНАЕ СПАБОРНІЦТВА МТС

**СМАЛЯВІЧЫ.**

Абмеркаваўшы адозву ўдзельнікаў Усесаюзнага спаборніцтва—дырэктароў перадавых МТС Днепрапетроўскай вобласці, рабочыя, інжынерна-тэхнічны персанал Смалявіцкай МТС уключаюцца ва Усесаюзнае спаборніцтва МТС за высокі ўраджай, рэнтабельнасць МТС у 1937 годзе і абавязваюцца:

Ураджай у калгасах МТС сабраць не менш 14 цэнтнераў зернавых і 1000 пудоў з гектара. Каб забяспечыць такі ўраджай, абавязваемся ўнесці пад яравыя пасевы 1000 тон мінеральных угнаенняў, 4500 тон гною і 75500 тон торфу. Усе насенныя ўчасткі пасеем гатунковым зярном а такім разлікам, каб у 1938 годзе ўсё ён быў забяспечан гатунковым насеннем для ўсёй плошчы.

Веснавое баранаванне азімых абавязваемся правесці на ўсёй плошчы, падкармліць азімыя на плошчы не менш 2000 гектараў. Радковай сеялкай засеяць 4500 гектараў.

На кожны 15-сільны трактар давесці ў сярэднім выпрацоўку па МТС 600 гектараў з сярэдняй сутачнай выпрацоўкай не менш 6 гектараў на трактар. На кожны трактар «ЧТЗ» выпрацаваць у сярэднім 2000 гектараў, на ільнацерабілку «ВНИИЛ-5» даць 120 га, пасеяць радковай сеялкай 350 гектараў, убраць паўночным камбайнам 150 гектараў. Атрымаць у 1937 годзе па МТС 100.000 рублёў накаплення.

У аснову ўсёй работы мы кладзем шырокае прымяненне стаханаўскіх метадаў работы, разгортванне крытыкі і самакрытыкі недахопаў нашай работы, павышэнне класавай пільнасці да ворагаў народу з тым каб не адна трацкісцкая гадзіна не пасмела сунуць свой нос ў нашу сацыялістычную сельскую гаспадарку.

**БАСАЛЫГА — дырэктар МТС, КУДЗЕЛЬКА — парторг, БУЦЬКО — рабочком, брыгадзіры-стаханаўцы: ЛЮТАРЭВІЧ, КАСЦЯНЕВІЧ, трактарысты-стаханаўцы: ГАНЧАРЫК, ЛАПЦЁНАК, ЖЫЛКА.**

## ДАБ'ЁМСЯ ВЫСОКАГА ЎРАДЖАЮ

Па-ўдарнаму праходзіць падрыхтоўчая работа да пасеўнай кампаніі ў сельгасарцелі «Сталінскі прызыў», Панізоўскага сельсовета, Аршанскага раёна. Яшчэ ў снежні мінулага года калгас пачаў вывазку гною. На 1 сакавіка вывезена 800 вазоў гною.

На агульным сходзе калгаснікі пастанавілі збіраць попел і курыны памёт. У работу па збору попелу ўключыліся ўсе калгаснікі і калгасніцы. Калгаснік Свірыдаў Васіль сабраў ужо 15 цэнтнераў попелу.

Праўленне калгаса зварачае асаблівую ўвагу на цягавую сілу. Устаноўлен кантроль над работай конюхаў. Усе коні вышэй сярэдняй укормленасці. На час пасеўнай кампаніі забраніравана 1000 пудоў сена і 6 тон аўса. Сельгаспадарчы інвентар адрамантаван.

**К. ГАРАВЕЦ.**

**ПУХАВІЧЫ.**

Работнікі Пухавіцкай МТС, ІТР, рабочыя, брыгадзіры і трактарысты ўключыліся ва Ўсесаюзнае спаборніцтва МТС і абавязаліся сутачную выпрацоўку на трактар «ХТЗ» давесці не менш чым да 7,5 гектара і на «ЧТЗ» не менш 20 гектараў. Выпрацоўку па 15-сільны трактар давесці да 630 гектараў за сезон і на «ЧТЗ» — 2500 гектараў.

Кожнай 24-радковай сеялкай засяваць у дзень не менш 25 гектараў. Ураджай зернавых культур на ўсіх насенных участках атрымаць па 120—150 пудоў з гектара. У кожным калгасе ўвесці гатунак бульбы «вольтман» з тым, каб у 1938 годзе сяўба бульбы была праведзена гатункам «вольтман», а таксама пачата асваенне гатунку бульбы «юбель».

Каб стварыць фонд накаплення сродкаў, МТС абавязалася эканоміць гаручага не менш 6 проц. на рамонце сельгасмашын і на прыцэпах—10 проц., на рамонце трактараў і камбайнаў — 10 проц., скарачэнне халастых пераездаў да 10 проц., эканоміць сродкаў не менш 10 процантаў з кожнага апрацаванага гектара.

# Своечасова падрыхтавацца да яравізацыі

Яравізацыя, як прыём агратэхнікі, асвоены на тэорыі развіцця расліны, зыпрацаваны акадэмікам Лысенка, моцна ўвайшла ў практыку калгасаў Калі ў 1935 г. па БССР пад яравізаванымі пасевамі было занята 1102 гектара, у 1936 г. — 20.000 гектараў, то ў пасеўную 1937 г. запраектавана пад яравізаванымі пасевамі заняць 50.000 гектараў, а па ўсяму Саюзу—9 мільёнаў гектараў.

Вось некаторыя прыклады, якія паказваюць эфектыўнасць прымянення яравізацыі ў калгасах БССР. У 1935 г. ў калгасе «Чырвоная Лучна» Полацкага раёна яравізаваны авёс даў ураджай 19,24 цэнт. з гектара, а неяравізаваны — 11,64 цэнтнера. Ад прымянення яравізацыі калгас атрымаў прыбаўку ва ўраджаі на 7,6 цнт. аўса з гектара. Другі калгас імя Варашылава таго-ж раёна пры пасеве яравізаваным ячменем атрымаў ураджай 17,28 цнт. з гектара, а неяравізаваны звычайны пасеў даў 11,5 цнт. з гектара. У калгасе «Пабеда» Дзержынскага раёна яравізаваная пшаніца дала 20,2 цнт. з гектара, а пшаніца звычайнага пасеву — 17 цнт. Або ў калгасе «Совецкая Беларусь» Даманавіцкага раёна яравізаваная пшаніца дала ўраджай 14,3 цнт., а неяравізаваная — 9,1 цнт.

Па даных 53 калгасаў сярэдняя прыбаўка ад яравізацыі пшаніцы атрымана ў 1,7 цнт. з гектара.

У 1936 г., не гледзячы на неспрыяючыя кліматычныя ўмовы, рэзультаты ад прымянення яравізацыі атрымаліся станоўчыя. Калгас «Камбайн» Слуцкага раёна атрымаў прыбаўку ўраджаю ад яравізацыі аўса 5,1 цнт. з гектара, ячменю — 2,2 цнт. У калгасе «Комінтэрн» Магілеўскага раёна ў рэзультаце яравізацыі пшаніцы ўраджай атрыман вышэй звычайнага на 3 цнт. з гектара, у калгасе «Саха і молат» таго-ж раёна — 1.72 цнт. з гектара. Такія-ж лічбы і па цэламу раду другіх калгасаў БССР.

У мінулым годзе Інстытутам біялогіі былі пастаўлены масавыя вопыты ў 25 калгасах БССР па яравізацыі ільну. Рэзультаты яравізацыі ільну, таксама як і яравізацыя зернавых, атрымаліся станоўчыя. Для прыкладу можна прывесці калгас імя Леніна Мозырскага раёна. Тут атрымалі ад яравізацыі ільну ўраджай па саломцы 24,8 цнт. з гектара. Звычайны пасеў даў 17,4 цнт. саломкі з гектара. Ураджай ільнасемя яравізаванага пасеву складае 7,6 цнт. з гектара, а са звычайнага пасеву атрымана насення 6,4 цнт. У тым-жа калгасе «Чырвоная Лучна» Полацкага раёна ў рэзультаце яравізацыі ўраджай перавышае звычайныя пасевы на саломцы на 3,85 цнт. з гектара а ільнасемя — 0,9 цнт., у калгасе «Камбайн» Слуцкага раёна на 2 цнт. з гектара. Падобныя прыклады наглядзіліся ў цэлым радзе другіх калгасаў.

Апрача гэтага пры яравізацыі ільну скарачаецца вегетацыйны перыяд на 5—7 дзён і павялічваецца агульная тэхнічная даўжыня ільну ад 3 да 10 см.

Прывезеныя даныя па яравізацыі зернавых і ільну наглядна паказваюць, якое вялікае значэнне мае правільнае прымяненне гэтага метаду ў барацьбе за павышэнне ўраджайнасці сацыялістычных палёў.

У мэтах паспяховага правядзення яравізаванай сяўбы ў калгасах БССР і выканання намечанага плана ў 1937 г. па яравізацыі, неабходна ў першую чаргу арганізаваць падрыхтоўку яравізатараў, страномаў, лепшых вопытнікаў - калгаснікаў. Гэту работу неабходна разгарнуць зараз-жа, не адкладаючы. Трэба ўлічыць ўрокі мінулага года, калі ва многіх раёнах у часе сяўбы нельга было дастаць звычайнага тэрмометра, неабходнага для яравізацыі, не было ў продажы інструкцыі па яравізацыі. Наркамзему БССР трэба неадкладна дагаварыцца з адпаведнымі гандлёвымі арганізацыямі аб своечасовай закупцы неабходнай колькасці тэрмометраў, агародніх лесак, мерных цыліндраў, літаратуры па яравізацыі і інш.

У гэту вясну неабходна ліквідаваць усе недахопы, якія меліся пры правядзенні яравізацыі. Часам парушалася інструкцыя пры вільготнасці насення, а таксама ў перыяд яравізацыі дапускалася моднае прарастанне насення, якое ў далейшым аслабляла расліну. Патрэбна забяспечыць нагляд і дасканалы ўчот ўраджаю яравізаваных пасеваў, абавязаўшы гэтаму не толькі яравізатара, але і старшыню калгаса.

Пры гэтым яшчэ патрэбна памятаць аб высокай агратэхніцы, на базе якой яравізацыя дае вялікія рэзультаты. Парушэнне элементарнай агратэхнікі знікае рэзультаты яравізацыі.

Шырокае прымяненне навейшых дасягненняў сельскагаспадарчай навукі па сацыялістычных палях БССР дапаможа выканаць задачу, пастаўленую нашым любімым правадыром таварышам Сталіным дабіцца ў бліжэйшым будучым 7—8 мільярдаў пудоў зярна.

**Н. С. СУДНІК.**

**Навуковы работнік Інстытута біялогіі Акадэміі навук БССР.**

# НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

## Буйны поспех рэспубліканцаў на гвадалахарскім фронце

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 14 сакавіка. (БЕЛТА). Паведамленні з Мадрыда, якія апісваюць поспехі ўрадавых войск на гвадалахарскім фронце (на паўночны ўсход ад Мадрыда), у асаблівасці адзначаюць эфектыўнае супрацоўніцтва ўрадавай авіяцыі і артылерыі. На працягу ўчарашняга дня ўрадавыя самалёты ўвесь час бамбардыравалі і абстрэльвалі з кулямётаў як войскі, так і самалёты непрыяцеля. Паводле слоў паведамлення, апублікаванага ў Мадрыдзе, урадавыя лётчыкі бачылі, як цэлыя батальёны італьянскіх дывізій у беспарадку адступалі па галоўнай гвадалахарскай дарозе. Урадавыя самалёты абстрэльвалі ўцякаўшых з кулямётаў і прычынілі праціўніку вялікія страты. Паветраная бамбардыроўка нанесла вялікую шкоду ваенным матэрыялам праціўніка. Быў падпалены рад грузавікоў. Урадавыя самалёты-знішчальнікі прымусілі ўцякаць тры «Юнкерсы» і пераш кодзілі, такім чынам, бамбардыроўцы ўрадавых пазіцый.

Як перадае агенцтва Рэйтэр, рэспубліканцы, як відаць, атакуюць адступаючых італьянцаў з абодвух флангаў у даліне ракі Тахунья. Паведамляюць, што рэспубліканцы прасунуліся ўперад па арагонскай дарозе амаль на 5 кіламетраў.

***

ВАЛЕНСІЯ, 14 сакавіка. (БЕЛТА). Вячэрнія газеты буйным шрыфтам на першай старонцы друкуюць наступнае паведамленне іспанскага міністэрства авіяцыі і марскага флота:

«Камандуючы паветранымі сіламі паведамляе, што ўрадавая авіяцыя нанесла жорсткую страту італьянскім дывізіям на гвадалахарскім фронце. Італьянскія войскі былі прымушаны ўцякаць. Колькасць страт велізарная».

Вячэрнія газеты паведамляюць таксама далёкавыя весткі аб рэзультатах баёў на гвадалахарскім фронце. Развіваючы сваю контратаку, урадавыя войскі прасунуліся на 5 кіламетраў, дасягнуўшы 90-га кіламетра на арагонскай шасе. Занятыя пазіцыі былі зараз-жа ўмацаваны. Газеты пацвярджаюць таксама весткі аб тым, што праціўнік страціў вялікую колькасць танкаў і грузавікоў.

Аднак, газеты не выпускаюць з-пад увагі, што небяспека, створаная італьянскім наступленнем на гвадалахарскім фронце, ні ў якай меры яшчэ не знішчана. Комуністычная газета «Фрэнтэ рохо» поўнасцю ўяўляе сабе тое, што толькі самымі рашучымі мерамі, толькі напружаннем усіх сіл магчыма прадухіліць цяжкія вынікі новага наступлення фашысцкіх мяцежнікаў і інтэрвентаў.

***

ПАРЫЖ, 15 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас, рэспубліканцы ў рэзультаце кароткай контратакі занялі вёску Вальдэарэнас (каля 30 кіламетраў на паўночны ўсход ад Гвадалахары).

На гвадалахарскім фронце (на паўночны ўсход ад Мадрыда) рэспубліканцамі заняты новыя важныя стратэгічныя пазіцыі. Байцы з энтузіязмам атакавалі непрыяцеля і нанеслі яму вельмі вялікія страты. Захвачан 31 італьянскі палонны. Урадавая авіяцыя збіла тры самалёты праціўніка.

***

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 15 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, паражэнне, нанесенае італьянцам на гвадалахарскім фронце, выклікала лікаванне ў сталіцы. Аднак, мадрыскі друк перасцерагае супроць празмернага аптымізма.

Мадрыдскі карэспандэнт ліберальнай англійскай газеты «Ньюс кронікл» указвае, што перамога рэспубліканскіх войск тлумачыцца іх больш умелай тактыкай, а таксама лепшым маральным становішчам войск мяцежнікаў.

## Атакі праціўніка ў раёне р. Харамы адбіты

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзіденцыя ўрада), 14 сакавіка. (БЕЛТА). Баі на рацэ Хараме (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда) працягваюцца. Усе атакі мяцежнікаў, зробленыя пры падтрымцы авіяцыі, адбіты. У прыватнасці, адбіта моцная кавалерыйская атака праціўніка. Тры эскадроны мяцежнікаў поўнасцю знішчаны агнём урадавых войск. Падбіты 4 танкеткі праціўніка.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 15 сакавіка. (БЕЛТА). Учора ў 22 гадзіны камітэт абароны Мадрыда паведаміў, што ў раёне ракі Харамы (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда) рэспубліканскія войскі паспяхова атакавалі праціўніка і прасунуліся наперад.

## Заява Ларго Кабальеро карэспандэнту „Тан"

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 13 сакавіка. (БЕЛТА). Газета «Тан» (афіцыёз міністэрства замежных спраў) змясціла заяву, зробленую іспанскім прэм'ерам Ларго Кабальеро карэспандэнту газеты ў Валенсіі. Ларго Кабальеро перш за ўсё абверг чуткі, пашыраемыя замежным друкам, нібыта ён мае намер выйсці ў адстаўку.

Закранаючы перспектывы развіцця рэвалюцыйнага руху ў Іспаніі, Ларго Кабальеро заявіў: «Цяжка прадбачыць, якой будзе Іспанія заўтрашняга дня. Ясна, што яна не будзе такой, якой была. Зусім не з'яўляецца непраўдападобным вядомы пераходны перыяд. Аднак, мы ніколі не дапусцім, каб нам быў навязан большэвізм ці анархія. К таму-ж ніхто не памышляе тут навязаць нам большэвізм ці анархію.

Канфіскацыя ці кантроль над прыватнымі прадпрыемствамі, правадзімыя зараз, з'яўляюцца толькі часовай мерай. Вельмі часта прадпрыемствы канфіскоўваліся для таго, каб замяніць ушкшы кіруючы персанал гэтых прадпрыемстваў і такім шляхам забяспечыць працяг вытворчасці. Але гэты выключны перыяд пройдзе. На прадпрыемствах трэба будзе стварыць нармальныя ўмовы і адносіны. Урад будзе кіраваць гэтай эвалюцыяй і ў тэхнічным, і ў эканамічным плане. Ён зможа нацыяналізаваць буйныя прадпрыемствы, муніцыпалізаваць комунальныя прадпрыемствы ці перадаць буйныя зямельныя ўладанні калектывам працоўных. Гэта мае месца і за граніцай. Аднак, ва ўсякім выпадку, дробная ўласнасць, дробны гандаль і дробная прамысловасць не пацерпяць. Іспанская рэспубліка захавае, як відаць, сваю ранейшую палітычную форму.

Ларго Кабальеро аптымістычна глядзіць на ваенныя перспектывы рэспубліканскай Іспаніі, указваючы, што, не гледзячы на наяўнасць у Іспаніі замежных войск, у надыходзячых баях «рэспубліканцы возьмуць ініцыятыву ў свае рукі».

Рэспубліканская Іспанія, заявіў далей прэм'ер, не збіраецца адмаўляцца ад свайго права на Марока.

Паводле слоў Ларго Кабальеро, ніякае пагадненне паміж мяцежнікамі і рэспубліканцамі немагчыма, і пяперашняя вайна можа закончыцца толькі «поўнай перамогай рэспубліканцаў ці перамогай праціўніка». «Мы будзем біцца да канца, — падкрэсліў прэм'ер. — У нас ёсць людзі. Нам не дастае толькі зброі».

Працоўныя Стакгольма вітаюць шведскага матроса Эрыка Янсона, які вярнуўся пасля адбыцця турэмнага зняволення ў Германіі за распаўсюджанне антыфашысцкай літаратуры. (СФ).

# НА КАНГРЭСЕ МІРУ І ДРУЖБЫ З СССР

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 14 сакавіка. (БЕЛТА). На сёнешнім ранішнім пасяджанні кангрэса міру і дружбы з СССР абмяркоўвалася пытанне аб совецкай планавай гаспадарцы. Пасяджанне прахадзіла пад старшынствам члена парламента Элеаноры Ратбон, якая ў сваім выступленні ахарактарызавала планавыя метады, як стрыжань совецкай эканомікі.

Соцыяліст Коль у сваім выступленні адзначыў, што з кожнай новай пяцігодкай усё хутчэй будзе ўзрастаць удзельная вага вытворчасці прадметаў спажывання.

Дэлегат ад кааператыўных арганізацый Рывс падрабязна апісаў арганізацыю совецкай кааперацыі.

Джон Стрэчы апісаў працэс соцыялістычнага планавання ў СССР і метады складання дзяржаўнага плана.

Перайшоўшы да барацьбы супроць фашызма, Стрэчы гаварыў аб неабходнасці адзінства ўсіх антыфашыстаў у гэтай барацьбе.

Кангрэс віталі прадстаўнік Новазеландскага (Новая Зеландыя — англійскі дамініён (самакіруючаяся калонія) на паўднёвы ўсход ад Аўстраліі) таварыства прыяцеляў Совецкага Саюза Кук і індыйскі студэнт Хансар.

З даклада мандатнай камісіі кангрэса высветлілася, што на кангрэсе прадстаўлена 2.834.680 членаў розных арганізацый. Гэта больш чым удвая перавышае лік людзей, прадстаўленых на папярэднім кангрэсе.

На ўчарашнім вячэрнім пасяджанні пад старшынствам лорда Ален оф Хартвуда кангрэс абмяркоўваў пытанне аб культурным развіцці Совецкага Саюза. Выступалі Алексей Талстой, Бернард Пейрэс, школьнік Шульц, тэатральны крытык Губерт Грыфітс, прафесар Канстэбль і інш.

***

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 14 сакавіка. (БЕЛТА). Кангрэсам міру і дружбы з СССР прынята рэзалюцыя аб стварэнні пастаяннага камітэта міру і дружбы з СССР, аб арганізацыі падобных-жа камітэтаў у галоўных гарадах Англіі, аб пасылцы дэлегацый у СССР і скліканні ўсеанглійскага кангрэса міру і дружбы з СССР у Лондане не пазней канца 1938 года.

Па прапанове вялікага французскага пісьменніка Рамэна Ралана прынята рашэнне ўстанавіць сувязь з арганізацыямі ў іншых краінах, якія ставяць сабе падобныя-ж мэты, каб наладзіць міжнародную дэманстрацыю к 20 гадавіне Вялікай пролетарскай рэволюцыі. Таксама прынята рашэнне наладзіць дэманстрацыю ў Англіі к 20-годдзю Вялікай пролетарскай рэволюцыі.

Увечары на заключным пасяджанні дэлегатам кангрэса былі паказаны совецкія кінофільмы. Перад дэманстрацыяй фільмаў з кароткім словам выступіў Алексей Талстой.

# Германа-італьянскі праект заходняга пакта

Пасля амаль чатырохмесячнага маўчання ўрады Германіі і Італіі нарэшце перадалі паслам Англіі ў Берліне і Рыме адказ на лістападаўскую ноту Англіі аб заходнім пакце. Новы пакт, па думцы фашысцкіх дзяржаў, павінен развязаць ім рукі, даць свабоду дзеянняў для Германіі — ва Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропе і для Італіі — у Міжземным моры.

Як адзначае орган чэхаславацкага міністэрства замежных спраў «Прагер-Прэсе», Германія яшчэ раз імкнецца шляхам заключэння заходнееўрапейскага пакта расчысціць шлях для ажыццяўлення сваіх агрэсіўных планаў.

Германа-італьянскае выступленне, як пішуць французскія газеты, накіравана на зрыў калектыўнай бяспечнасці. Абедзве фашысцкія дзяржавы патрабуюць, каб Францыя адмовілася ад сваіх абавязацельстваў, прадугледжаных дагаворамі аб узаемадапамозе, асабліва з Совецкім Саюзам, і статутам Лігі нацый. Адначасова яны імкнуцца пасварыць Францыю з яе старымі саюзнікамі — краінамі Малой Антанты і Польшчай. Мэта абодвух агрэсараў — убіць клін ва ўзаемаадносіны Францыі і Англіі, Францыі і Бельгіі. Германія імкнецца заключыць спецыяльны дагавор аб бельгійскім «нейтралітэце», які гарантаваны «чэсным словам» Гітлера.

Заходнееўрапейскі пакт, па думцы Берліна (сталіца Германіі), павінен з'явіцца двухбаковым пагадненнем паміж Германіяй і Францыяй, прычым гарантаваць яго павінны Англія і Італія.

Германа-італьянскі праект з'яўляецца адкрытай стаўкай на ізаляцыю Францыі, на адрыў яе ад саюзнікаў ва Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропе.

# ПОМНІКІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ Ў БССР

Пад старшынствам старшыні ПВК БССР тав. А. Г. Чарвякова адбылося пасяджанне Цэнтральнай камісіі па ахове і пабудове помнікаў грамадзянскай вайны і Чырвонай Арміі.

Камісія зацвердзіла праект пабудовы ў Барысаве абеліска ў гонар перамог Чырвонай Арміі, якая прарвала фронт праз Бярэзіну і забяспечыла вызваленне БССР ад белапольскіх акупантаў.

Для абеліска адведзен участак у паўтары гектараў зямлі на высокім беразе ракі Бярэзіны ў аўтастрады Менск—Масква. Вышыня помніка—20 метраў. Ён будзе відзён за 20 кіламетраў. Вакол помніка разбіваецца парк.

Абеліск і фігуры на ім адлюстроўваюць пераможна-наступальны рух Чырвонай Арміі.

Падрыхтоўка да пабудовы абеліска ўжо вядзецца. Ён будзе зроблен з чорна-серабрыстага камня накшталт мрамара, знойдзенага ў Барысаўскім рабне. Да 20-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі помнік будзе адкрыт. Аўтар—скульптар Глебаў.

Цэнтральная камісія прапанавала барысаўскаму горсавету ўстанавіць у зале пасяджэнняў мемарыяльную дошку — помнік Серго Орджанікідзе, прымаўшага непасрэдны ўдзел у баях за вызваленне БССР ад белапалякаў.

Старшыня бабруйскага гарадскога совета т. Скакун прадставіў камісіі макет помніка грамадзянскай вайны ў Бабруйску — работы беларускага скульптара Бембеля. Помнік будзе ўяўляць з сябе 5-фігурную групу на вялікім пастаменце. Яго мяркуецца адліць з чыгуна.

Камісія прыняла праект, прадстаўлены бабруйскім горсоветам, за аснову. Скульптару Бембелю даручана ўнесці рад змен у пастаменце. Работа павінна весціся з таго разлікам, каб адкрыць помнік да 20-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі.

На гэтым-жа пасяджанні прызнана неабходным распачаць падрыхтоўку да пабудовы помнікаў у гонар перамог Чырвонай Арміі ў Полацку, Лепелі, Слуцку, Мозыры, Магілеве і Рэчыцы. Арганізуюцца экскурсіі рабочых, калгаснікаў, школьнікаў, піянераў, чырвоных партызан да помнікаў грамадзянскай вайны.

Будуць устаноўлены мемарыяльныя дошкі на мясцах выдатных падзей грамадзянскай вайны—на плошчах, гістарычных будынках, вакзалах і прыстанях.

М. КІН.

## УВЕКАВЕЧАННЕ ПАМЯЦІ Ю. М. ПЭНА

У Доме мастака ў Менску адбыўся агульны сход мастакоў і скульптараў сталіцы БССР, прысвечаны памяці Ю. М. Пэна.

З успамінамі аб Ю. М. Пэне выступілі тт. Бразер, Гаўрылёнка, Кудрэвіч, Грубэ і інш. Сход вызначыў рад мерапрыемстваў па ўвекавечанню памяці Ю. М. Пэна. У бліжэйшы час арганізуецца ў Менску выстаўка яго твораў. Узнята пытанне перад Кіраўніцтвам па справах мастацтваў пры СНК БССР аб выдзяленні трох стыпендый імя Ю. М. Пэна для лепшых студэнтаў віцебскага мастацкага вучылішча і ўстанаўленні двух штогодніх прэмій за лепшыя работы мастакам БССР—удзельнікам мастацкіх выставак. Перад віцебскім гарадскім саветам ставіцца пытанне аб пабудове на адным з сквераў Віцебска помніка Ю. М. Пэну і найменаванні адной з вуліц яго імем.

Будзе створана карцінная галярэя з твораў Ю. М. Пэна, выдана манаграфія аб выдатным мастаку і серыя адкрытак з яго твораў.

У сваім рашэнні мастакі патрабуюць ад совецкага суда самага суровага пакарання забойцаў Ю. М. Пэна.

## МАСТАЦКАЯ СПАДЧЫНА Ю. М. ПЭНА

Для прыняцця мастацкай спадчыны і архіва Ю. М. Пэна Саўнарком БССР стварыў камісію ў складзе прэзідэнта Акадэміі навук БССР акадэміка Сурты (старшыня), Юркова, Пасюкевіча, Сухаручніка і Пашкевіча.

## НА РЭКАХ БССР

Па даных гідра-метэаралагічнай службы многія мелкія рэкі БССР ускрыліся. На Заходняй Дзвіне і Сожы — лёдаставы. Пад ільдом таксама Прыпяць і Бярэзіна. Аднак ля Турава на Прыпяці лёд адтаяў ля берагоў. У Барысаве на Бярэзіне і ў Жлобіне на Дняпры спынена конная пераправа.

***

На рацэ Свіслач у Менску за суткі вада падняслася на 30 сантыметраў. За гэты-ж час узровень ракі каля чарапічнага завода ў Крупках падняўся на 48 сантыметраў, а каля Зарэчча — на 98 сантыметраў. Учора за 2 гадзіны — з 9 гадзін раніцы да 11 гадзін дня — узровень ракі ў горадзе падняўся на 7 сантыметраў. У вярхоўях ракі пачаўся ледаход.

На Свіслачы з сёнешняга дня ўстанаўляецца кругласутачнае дзяжурства ля лімніграфа (прыбор для механічнага запісу ўзроўню вады).

## МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАПАМОГА НА САМАЛЁЦ

ЧЭРВЕНЬ. Калгасніца сельгасарт. «Першамайск», Раваніцкага сельсовета Чэрвеньскага раёна Дзяруга Зося нарадзила двойню. Але пасля родаў у яе пачалося моцнае крывяцячэнне. Патрабавалася хуткая медыцынская дапамога. Калгас «Першамайск» — самы далёкі ад раённага цэнтра, ён знаходзіцца ад яго за 3 кіламетраў. З Раваніцкага сельсовета патрабавалі дапамогі з раённай больніцы, аднак, каб даехаць на фурманцы да калгаса, неабходна 5 гадзін.

Запыталі Менск. Праз 45 мін. спусціўся самалёт, маючы на борце кваліфікаваных урачоў. Калгасніцы была аказана патрэбная дапамога.

Радзіха і ўсе калгаснікі выказалі вялікую падзяку партыі, ураду і асабіста таварышу Сталіну за іх клопаты аб мацеры і дзецях.

А. АСТАПЕНЯ.

## ВЫПУСК БЕЛАРУСКАЙ КАВАЛЕРЫЙСКАЙ ШКОЛЫ

Адбыўся другі выпуск курсантаў Беларускай кавалерыйскай школы Асоавіяхіма. На працягу чатырох з паловай месяцаў 60 калгаснікаў з розных куткоў Совецкай Беларусі рыхтавалі з сябе загатовачыкаў калгасных конетаварных фермаў, лёгкіх коннікаў і трапных стралкоў. 50 пропантаў выпускнікоў здалі нормы на варашылаўскага стралка другой ступені, у кожнага з іх красуюцца на грудзях значкі «Варашылаўскі коннік» і «ПІХА».

## АД ЦЕРАХОЎСКАГА РК КП(б)Б

Згублены партбілет узору 1936 г., выданы Сталінскім райкомам КП(б)Б Менска на імя Гордзінай Сары Мандзелеўны за № 0855880, лічыць несапраўдным.

Сакратар Церахоўскага райкома КП(б)Б КЕКЧЫК.

## АД КЛІЧАЎСКАГА РК КП(б)Б

Згублены партбілет узору 1936 года, выданы Клічаўскім РК КП(б)Б на імя Багаценка Нікалая Мацвеевіча за № 0863294, лічыць несапраўдным.

Сакратар Клічаўскага РК КП(б)Б. ЦІШКЕВІЧ.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

УСЕ НА ВЫСТАЎКУ!

З 12 САКАВІКА вул. Кірава, 12

БЕЛШВЕЙТРЭСТАМ

УСЕ НА ВЫСТАЎКУ!

У КЛУБЕ МЕТАЛІСТАЎ, радам з стадыёнам „ДЫНАМА"

АДКРЫТА

—ВЫСТАЎКА—

МАДЭЛЯЎ ФАСОНАЎ ШВЕЙНЫХ ВЫРАБАЎ | МУЖЧЫНСКАГА, ЖАНОЧАГА І ДЗІЦЯЧАГА АСАРТЫМЕНТУ

ДЛЯ ЗАЦВЕРДЖАННЯ НА АСЕННЕ-ЗІМОВЫ СЕЗОН 2-га ПАЎГОДДЗЯ 1937 г.

ВЫСТАЎКА АДКРЫТА ШТОДЗЕННА ДА 21 САКАВІКА г. г. З 11 гадзін РАНІЦЫ да 11 гадзін ВЕЧАРА.

ПРЫ ВЫСТАЎЦЫ працуюць ЭКСКУРСАВОДЫ | ПРЫ ВЫСТАЎЦЫ працуе ВЕШАЛКА. УВАХОД ВОЛЬНЫ.

БЕЛШВЕЙТРЭСТ.

ДА ЎВАГІ ДАКЛАДЧЫКАЎ, АГІТАТАРАЎ І ПРАПАГАНДЫСТАЎ

да дня 66-й гадавіны ПАРЫЖСКАЙ КОМУНЫ

Белпартвыдавецтвам ЦК КП(б)Б выпушчаны на беларускай мове:

К. МАРКС. ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА ВА ФРАНЦЫІ. Цана 1 руб.

Брашура — ДЗЕНЬ ПАРЫЖСКАЙ КОМУНЫ — ДЗЕНЬ МОПР'а Цана 35 к.

ПАТРАБУЙЦЕ ва ўсіх гарадскіх і раённых КНІГАРНЯХ І КІЁСКАХ.

БЕЛПАРТВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б.

ЗАГАД № 431

ПА НАРОДНАМУ КАМІСАРЫЯТУ АСВЕТЫ БССР

13 сакавіка 1937 г. г. Менск.

Абследаванне школ Журавіцкага і Прапойскага раёнаў паказала, што не гледзячы на мой загад за № 369 ад 24 лютага г. г. працягваецца выкладанне працы ў школах гэтых раёнаў.

ЗАГАДВАЮ:

1. За невыкананне майго загада аб спыненні з 1 сакавіка г. г. выкладання ва ўсіх школах працы стаўлю на від загадчыку Журавіцкага раёна т. Жукоўскаму і загадчыку Прапойскага раёна т. Сомаву.
2. Прапаную тт. Жукоўскаму і Сомаву неадкладна спыніць выкладанне ў школах працы.
3. Аб выкананні гэтага тэлеграфна паведаміць мне.

Народны камісар асветы БССР ДЗЯКАЎ.

У мястэчку АСТРАШЫЦКІ ГАРАДОК

АДКРЫТ СЕЛЬСКІ УНІВЕРМАГ

У магазіне ёсць у продажы ВЯЛІКІ ВЫБАР наступных тавараў:

Гатовае адзенне: мужчынскае жаночае дзіцячае

АБУТАК усіх размераў: мужчынскі жаночы дзіцячы і галошы

БАВАЎНЯНА-ПАПЯРОВЫЯ ШАРСЦЯНЫЯ ШОЎКАВЫЯ І ІЛЬНЯНЫЯ

РОЗНАСТАЙНЫ АСАРТЫМЕНТ ГАЛАНТАРЭІ, ПАРФЮМЕРЫІ І ХАРЧОВЫХ ТАВАРАЎ.

МЕНРАЙСПАЖЫЎСАЮЗ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1) АПОШНІЯ Абанемент № 58.

ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР БОЙТРЭ Абан. № 92

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» ДАРЫКО

Дзіячы гукавы кінотэатр ЮНАЦТВА ПАЭТА

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» АПОШНЯЯ НОЧ

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Гукавы кінотэатр «Спартак» «КАЗНЬ»

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 16 САКАВІКА: 8-30—«Апошнія паведамленні». 16-00—канцэрт. 17-00 — перадача для дзяцей. 18-30 — завочная партвучоба. 19-45 — песні народаў СССР (грамзапіс). 20-45—выступленне старшыні Аршанскага РВК. 28-00—«Апошнія паведамленні».

Украдзен наряд на атрыманне ў калгасе «Адраджэнне» 15 тон бульбы, выданы Менплодатрэстам на імя сталовай цагельнага завода № 1. Лічыць несапраўдным.

Беларускаму кіраўніцтву лесааховы і лесанасаджэнняў патрабуюцца для пастаяннай работы на перыферыі

ІНЖЫНЕРЫ па лясной гаспадарцы і лесакультурах,
УЧАСТКОВЫЯ ЛЯСНІЧЫЯ,
ЛЕСАТЭХНІКІ,
ЛЕСАУПАРАДКАВАЦЕЛІ — ТАКСАТАРЫ,
ПАМ. ТАКСАТАРЫ.

ЗАЯВЫ з прыкладаннем копіі прапоўнага спіса прысылаць па адрасу: г. Менск, пог Комсамольскай і К. Маркса, 33/24, Лесаахова.

Праектаванне абсталявання жылых і грамадскіх памяшканняў (санаторый, клубаў, устаноў і т. д.)

выконвае ПРАЕКТНА-КАНСТРУКТАРСКАЕ БЮРО ПРЫ ЎСЕКАПРАМЛЕСАЮЗЕ.

ЁСЦЬ ГАТОВЫЯ распрацаваныя праекты, альбомы і ўзоры мёблі.

ПРАПАНОВЫ НАКІРОЎВАЦЬ ПА АДРАСУ: Москва, Неглинная, 23, Всекопромлессоюз для конструкторскага бюро.

На падставе пастановы ОНК СССР «Аб адрэзцы зямель ад соўгасаў і іншых гаспадарак і аб павелічэнні за гэты лік зямель калгасаў» і загада Народнага камісарыята зернавых і жывёлагадоўчых соўгасаў СССР ад 8 студзеня 1937 года № 8, свінагадоўчы соўгас ВЫСОКАЕ, Клімавіцкага раёна, БССР

ЛІКВІДУЕЦЦА

Прэтэнзіі да ліквідуемага соўгаса належыць накіроўваць да 1 красавіка 1937 г. упаўнаважанаму па ліквідацыі т. Ігнатоўскаму па адрасу: паштовае аддзяленне Клімавічы, БССР.

Пасля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

ЛІКВІДКОМ.

Магілеўскі аўтарамонтны завод імя КІРАВА

У САКАВІКУ МЕСЯЦЫ

ПРЫМАЕ ГРУЗАВЫЯ АЎТАМАШЫНЫ ГАЗ, ЗІС, АМО

з выдачай адрамантаваных у 5-дзенны тэрмін,

а пры наяўнасці абаротных адрамантаваных машын, выдае машыны на наступны дзень,

пры ўмове выстаўлення акрэдытыва на бягучы рахунак завода № 40/1420.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА АСОБ — ЗДАТЧЫКАЎ СКУРАНОЙ СЫРАВІНЫ, што

маючыя на руках ЗАКУПАЧНЫЯ КВІТАНЦЫІ НА ЗДАНУЮ СЫРАВІНУ і неатрымаўшыя да гэтага часу тавараў па гэтых квітках, павінны ПРАД'ЯВІЦЬ іх

ДЛЯ АТРЫМАННЯ ТАВАРАЎ

НА ПРАЦЯГУ ДВУХ ТЫДНЯЎ з дня апублікавання гэтай аб'явы.

ПАСЛЯ ЎКАЗАНАГА ТЭРМІНА ЎСЕ РАЗЛІКІ ПА ГЭТЫХ КВІТКАХ БУДУЦЬ ЛІЧЫЦЦА ЗАКОНЧАНЫМІ.

МЕНСКАЯ РАЙЗАГОТКАНТОРА «САЮЗЗАГОТСКУР».